КАЛЁНКА РЭДАКТАРА

Наша стратэгія

Сёлета першыя дні траўня сталіся гістарычнымі для аб'яднанай Эўропы. Яна папоўнілася новымі сябрамі, у тым ліку і некалькімі краінамі - суседзямі Беларусі. І палякі, і літоўцы, зь якімі мы калісьці жылі ў адной дзяржаве, сьвяткавалі гэтую лёсавырашальную падзею, а беларусам заставалася толькі наракаць на саміх сябе і на выбар, зроблены 10 гадоў таму...

Сымбалічна, што якраз у гэтыя дні ў Менску праходзіў V Кангрэс Асамблеі няўрадавых дэмакратычных арганізацыяў Беларусі, на які прыехалі сотні дэлегатаў з усёй краіны. Важнасьць гэтай падзеі заключаецца, безумоўна, у прынятых Кангрэсам рашэньнях, але ня толькі. Ужо сам факт збору ў сталіцы такой колькасьці прадстаўнікоў НДА Беларусі ў цяперашняй сытуацыі стаўся своеасаблівай дэманстрацыяй сілы, патэнцыялу трэцяга сэктару. Як ні стараліся некаторыя чыноўнікі, судзьдзі і сілавікі, але "зачысьціць" і "разагнаць" няўрадавыя дэмакратычныя арганізацыі не ўдалося. Наадварот, яны паспрыялі большаму згуртаваньню грамадзкіх актывістаў перад тварам небясьпекі.

Важна было якраз цяпер сабрацца ўсім разам, абмяняцца думкамі, выпрацаваць канкрэтныя прапановы і рашэньні па далейшай дзейнасьці. Важна было адчуць, асабліва дзеячам з рэгіёнаў, што яны зусім не адзінокія ў сваіх праблемах і бедах - за імі стаіць сур'ёзная і моцная структура: Асамблея НДА Беларусі. Трэба было таксама абмеркаваць магчымы ўдзел НДА ў будучай палітычнай кампаніі - выбарах у Палату прадстаўнікоў, якія прыпадаюць на кастрычнік.

Кангрэс засьведчыў, што большасьць грамадзкіх актывістаў у той ці іншай форме возьмуць удзел

працяг на ст. 2

Зьмест

КАЛЁНКА РЭДАКТАРА 1

АСАМБЛЕЯ

Як стварыць моцны падмурак для партнэрства 2
Аксана Вайтовіч

ТЭМА

Пяты Кангрэс 3
Вінцэсь Дземянчук

Сяргей Мацкевіч: З надзеяй глядзець у будучыню 5
Інтэрвію з новым старшынём Рабочай групы Асамблеі

Заява V Кангрэсу Асамблеі НДА Беларусі "Аб перасьледзе грамадзкіх актывістаў" 6

Справаздачны выступ Алеся Бяляцкага 7

Прадстаўляем намесьнікаў старшыні Рабочай групы 10

Сэкцыі 11

Круглыя сталы 15
Вынікі працы

Неабходнасьць якасных зьменаў 17
Ірына Жыхар

Распрацоўка стратэгічнага пляну: гісторыя пытаньня 17

Стратэгічны плян разьвіцьця Асамблеі 18

Рэзалюцыя V Кангрэсу Асамблеі НДА Беларусі 20

Рух у накірунку дэмакратыі і свабоды 20
Джон Бэнджамін

6 РЭГІЁНАЎ 21

ЛІСТАВАНЬНЕ

Як дасягаецца высокая мэта 24
Генадзь Суднік

ПАДЗЕІ 24

ПОСЬПЕХ

Аптымістычны настрой 26
прынёс новы дыск "Старога Ольсы"
Алёна Андрэева

КАНСУЛЬТАЦЫЯ

Некаторыя асаблівасьці розных арганізацыйна-прававых формаў некамэрцыйных арганізацыяў 27
Вольга Смалянка

ПАРАЛЕЛІ

Румынскі дысыдэнт 33
Ядвіга Мацкевіч

ІНФАРМАТАР 34

BIBLIO

Спэцыфічнае выданьне 36
Сямён Асаевіч

КАЛЁНКА РЭДАКТАРА

пачатак на ст. 1

у гэтай выбарчай кампаніі. І хоць надзеі на правядзеньне ў краіне сапраўдных свабодных выбараў няма, многія апазыцыйныя структуры імкнуцца захапіць першы пляцдарм - правесьці сваіх людзей у дэпутаты няхай сабе і лукашэнкаўскага парлямэнту. І прыводзяць прыклад, як у 1991 г. невялічкая фракцыя БНФ у Вярхоўным Савеце БССР дамаглася ад праўладнай большасьці абвяшчэньня незалежнасьці Беларусі.

Сёлетняя палітычная кампанія, як і наступныя прэзыдэнцкія выбары, накладзе свой адбітак на дзейнасьць трэцяга сэктару. Ужо цяпер можна прагназаваць чарговыя хвалі рэпрэсіяў супраць непадкантрольных уладам НДА. І тых, хто зьбіраецца ўзяць удзел у выбарчых кампаніях, і тых, хто застанецца па-за імі. Цяпер жа складаецца ўражаньне, што ўлады прыглядаюцца і чакаюць нашых дзеяньняў. Добра арганізаваны і праведзены Кангрэс у пэўным сэнсе стаў для іх нечаканасьцю. Яны прыглядаюцца, наносячы час ад часу ўдары, апрабоўваючы новыя мэтады, тэхналёгіі, новую тактыку...

Але ня толькі наша арганізаванасьць, імкненьне навучыцца быць салідарнымі напалохала ўлады. Самае непрыемнае для іх тое, што трэці сэктар, нягледзячы на ўсе створаныя для яго праблемы і перашкоды, ня толькі займаецца іх пераадоленьнем, але і думае пра будучыню. Гэта было яскрава засьведчана прыняцьцем на Кангрэсе стратэгічнага пляну разьвіцьця Асамблеі НДА Беларусі на бліжэйшыя пяць гадоў. Так і хочацца зазначыць, што рэжымы прыходзяць і сыходзяць, а грамадзкая актыўнасьць людзей, арганізаваная і скаардынаваная, застаецца.

І самае галоўнае - гэта аптымізм, які не пакідае грамадзкіх актывістаў, не дазваляе ім бязьдзейнічаць і дапамагае мабілізоўваць сілы, падтрымлівае надзею на пазытыўныя зьмены ў грамадзка-палітычнай сытуацыі ў краіне. І не ў далёкай пэрспэктыве, а ўжо ў бліжэйшай будучыні.

Як стварыць моцны падмурак для партнэрства

У межах Асамблеі НДА з часу яе заснаваньня была зроблена не адна спроба наладзіць партнэрства паміж галіновымі арганізацыямі. Але, на жаль, прыкладаў пасьпяховага партнэрства ня так багата. Сярод апошніх можна адзначыць кампанію "Зробім лепш!", калі разам працавалі моладзевыя і сацыяльныя арганізацыі, альбо "Нашу салідарнасьць", у якой супрацоўнічалі праваабарончыя НДА.

Ад самага пачатку свайго існаваньня Асамблея мела накіраванасьць на распрацоўку і рэалізацыю нацыянальных праграмаў. Прычым пад нацыянальнай праграмай разумелася сумесная праца шэрагу арганізацыяў - сябраў Асамблеі, скіраваная на рашэньне грамадзкіх праблемаў, якія маюць агульнанацыянальнае значэньне. Гэтая праграма дазваляе пашырыць уплыў дэмакратычнага трэцяга сэктару на новыя незаангажаваныя ў палітычнае і грамадзкае жыцьцё групы насельніцтва.

Так, у лістападзе 1998 году, падчас правядзеньня II Кангрэсу Асамблеі, былі сфармуляваныя праблемныя зоны, у якіх НДА маглі б аб'яднаць свае намаганьні. Гэта і сацыяльная абарона розных групаў насельніцтва, і становішча рэгіянальнай няўрадавай прэсы, абарона правоў чалавека і правоў няўрадавых арганізацыяў, а таксама стан беларускай мовы і культуры, нацыянальнай адукацыі, незалежнага прафсаюзнага руху.

Таксама на II Кангрэсе быў распрацаваны і мэханізм фармаваньня нацыянальных праграмаў, што прадугледжваў наяўнасьць каардынатара, які з дапамогай Выканаўчага бюро будзе зьбіраць і аналізаваць прапановы НДА. Плянавалася, што менавіта з каардынатараў і будзе складацца Рабочая група Асамблеі. Аднак гэты мэханізм, як паказала практыка, не спрацаваў.

Тым ня менш вядома, што менавіта праз аб'яднаньне галіновых (тэматычных) арганізацыяў на тэматычных круглых сталах і па-за іх межамі (але ў рамках Асамблеі) ініцыявалася стварэньне сталых і даволі пасьпяховых партнэрскіх праграмаў. Напрыклад, такіх, як Беларуская асацыяцыя рэсурсавых цэнтраў, Асацыяцыя грамадзянскай адукацыі, кампанія "Зробім лепш!".

Не атрымалі пасьпяховага разьвіцьця партнэрскія нацыянальныя праграмы Асамблеі зь незалежнымі прафсаюзамі і СМІ пад агульнай назвай AKORD (Асацыяцыя камітэтаў грамадзкіх рэгіянальных дзеяньняў), з Хартыяй'97.

У свой час, напрыканцы 90-х гадоў, сацыяльныя арганізацыі мелі намер правесьці агульную працу ў межах нацыянальнай праграмы. Але арганізацыі не змаглі сфармуляваць агульную праблему, дзеля вырашэньня якой варта было б аб'яднаць высілкі. З таго часу ініцыятываў да супрацоўніцтва з боку сацыяльных арганізацыяў не ўзьнікала.

Асобнае месца займае супольная праца краязнаўчых і экалягічных арганізацыяў. З дапамогай Выканаўчага бюро Асамблеі яны вызначылі агульныя патрэбы для сваіх арганізацыяў, сфармавалі

працяг на ст. 23

Пяты Кангрэс

1-2 траўня ў Менску адбыўся V Кангрэс Асамблеі дэмакратычных няўрадавых арганізацыяў Беларусі. Галоўны кіруючы орган найбуйнейшай парасонавай структуры трэцяга сэктару краіны падвёў вынікі праведзенай працы, акрэсьліў шляхі далейшага разьвіцьця і перавыбраў кіраўніцтва.

У працы Кангрэсу ўзялі ўдзел 220 дэлегатаў і каля 40 гасьцей зь Беларусі і замежжа. Сярод замежных гасьцей прысутнічалі: прадстаўнік Міністэрства замежных справаў Вялікабрытаніі Джон Бэнджамін, дырэктар прадстаўніцтва ABA/CEELI (Асацыяцыі амэрыканскіх юрыстаў) у Беларусі Робэрт Хейер, прадстаўнік Латвійскага Трансатлянтычнага таварыства LATO Мартыньш Мурніекс (Латвія), прадстаўнічка швэдзкай парасонавай структуры "Форум Сюд" Оза Бэрглунд. **Д. Бэнджамін,** у прыватнасьці, адзначыў сымбалічнасьць моманту - якраз 1 траўня адбылося пашырэньне Эўразьвязу на ўсход. "Мы хочам, каб Беларусь жыла як частка эўрапейскай сям'і народаў... Гісторыя і час на баку дэмакратыі, а не дыктатуры", - сказаў ён.

Са справаздачай перад удзельнікамі Кангрэсу выступіў старшыня Асамблеі **Алесь Бяляцкі,** які таксама адказваў на пытаньні дэлегатаў. У першы дзень працы быў прэзэнтаваны стратэгічны плян Асамблеі, які абсалютнай большасьцю галасоў быў зацьверджаны пазьней. Яго прадстаўлялі **Сяргей Мацкевіч** (Цэнтар "Супольнасьць") і **Ірына Жыхар** ("Беларуская арганізацыя працоўных жанчын"). Стратэгію салідарных дзеяньняў у межах кампаніі "Наша салідарнасьць" прэзэнтавала **Алена Танкачова,** старшыня праўленьня закрытага Незалежнага таварыства прававых дасьледаваньняў. Танкачова папрасіла падняць рукі прадстаўнікоў тых арганізацыяў, якія былі ліквідаваныя альбо мелі папярэджаньні і іншыя праблемы. У залі ўзьняліся дзясяткі рук. У сваім выступе яна параўноўвала сытуацыю 2003 году з наступствамі перарэгістрацыі НДА ў 1999 г., калі грамадзкіх аб'яднаньняў паменшала амаль напалову. Па яе словах, калі б трэці сэктар змог стварыць стратэгію і арганізавана выступіць ужо тады, то "зачыстка" НДА ўзору 2003 году магла б не адбыцца.

Абмяркоўваліся і формы ўдзелу НДА ў парлямэнцкіх выбарах. **Вацлаў Арэшка** (ГА "Культурны кантакт") падчас свайго выступу параўнаў НДА з авангардам дэмакратычнага грамадзтва і заклікаў грамадзкіх актывістаў узяць актыўны ўдзел у мабілізацыйнай кампаніі і кантролі за выбарамі. "Кожны з нас не павінен заставацца ўбаку, - сказаў Арэшка. - Сытуацыя ў грамадзтве зьмяняецца ў лепшы бок, большасьць грамадзянаў не падтрымліваюць рэжым. У рэжыму вычарпаныя рэсурсы, а нам ужо час дзейнічаць". Некаторыя ўдзельнікі Кангрэсу мелі іншы погляд на гэтую праблему. Крытычна паставіўся да ўдзелу ў выбарах **Мікола Грышан** зь Дзятлава, які прадстаўляў ТБМ. Міхась Варанец (ГА "Воля да разьвіцьця", Слонім) у сваім выступе адзначыў, што "сваім удзелам у выбарах грамадзкія арганізацыі паспрыяюць кансэрвацыі цяперашняй сытуацыі, калі недэмакратычнай уладзе супрацьстаяць палітычныя сілы, якія шмат у чым дыскрэдытавалі сябе сваёй непасьлядоўнасьцю і непераборлівасьцю, якія ўсё больш і больш дэмакратычныя толькі па назве". На ягоны погляд, "лепш нічога не рабіць, чым рабіць абы-што ці невядома што і да таго ж коштам дэвальвацыі сваіх прынцыпаў і рэпутацыі". Праблема абмяркоўвалася пасьля на адной з сэкцыяў, і большасьць арганізацыяў - сябраў Асамблеі пагадзіліся зь неабходнасьцю супрацоўніцтва з палітычнымі структурамі падчас будучай выбарчай кампаніі. Мяркуецца, што грамадзкія арганізацыі возьмуць удзел у мабілізацыйнай і адукацыйнай кампаніях.

Першы дзень Кангрэсу завершыўся працай чатырох сэкцыяў,

Выбары старшыні Рабочай групы

вынікі якой прэзэнтаваліся на наступны дзень. Былі агучаныя рэкамэндацыі для Рабочай групы Асамблеі, а таксама адбылося галасаваньне па пытаньні прыняцьця стратэгічнага пляну разьвіцьця Асамблеі на бліжэйшыя 5 гадоў. Амаль усе дэлегаты падтрымалі плян, устрымаліся толькі 6 чалавек, супраць жа ніхто не галасаваў.

У другі дзень працы Кангрэсу, 2 траўня, адбыліся пасяджэньні галіновых круглых сталоў (права-абарончага, моладзевага, экалягічнага, сацыяльнага, жаночага і культурніцка-краязнаўчага, адукацыйнага і рэсурсавых цэнтраў). На іх было абмеркавана бачаньне месца арганізацыяў асобных накірункаў дзейнасьці ў кантэксьце стратэгічнага пляну разьвіцьця Асамблеі, а таксама вылучаліся кандыдаты ў сябры Рабочай групы Асамблеі.

Напрыканцы Кангрэсу адбылося галасаваньне, якім быў зацьверджаны склад новай Рабочай групы. У яе ўвайшлі 43 прадстаўнікі розных рэгіёнаў Беларусі і арганізацыяў самых разнастайных накірункаў дзейнасьці. На першым пасяджэньні Рабочая група абрала старшыню. Ім стаў Сяргей Мацкевіч, кіраўнік грамадзкага аб'яднаньня "Цэнтар "Супольнасьць". У старшыні цяпер пяць намесьнікаў (раней быў толькі адзін), што будзе садзейнічаць большай эфэктыўнасьці працы Асамблеі па ўсіх накірунках яе дзейнасьці.

{ ДАВЕДКА "АСАМБЛЕІ" }

I Кангрэс прайшоў у лютым 1997 г. Каля 250-ці грамадзкіх арганізацыяў абвесьцілі пра стварэньне Асамблеі НДА Беларусі.

На **II Кангрэсе** ў лістападзе 1998 г. былі прынятыя нацыянальныя праграмы Асамблеі, распрацаваны мэханізм іх фармаваньня, прынята рэзалюцыя аб стаўленьні НДА Беларусі да сытуацыі ў краіне.

III Кангрэс праходзіў 2-3 сьнежня 2000 г. На ім быў прыняты статут Асамблеі, рэзалюцыі аб правядзеньні грамадзкай мабілізацыйнай кампаніі падчас прэзыдэнцкіх выбараў 2001 г., аб удзеле ў кампаніі назіраньня, ухвала аб падтрымцы Каардынацыйнай рады дэмакратычных сілаў ды інш.

IV Кангрэс адбыўся 5-6 кастрычніка 2002 г. На ім была прынятая заява "Ў абарону незалежнасьці Беларусі" і рэзалюцыя "Аб стане правоў чалавека і грамадзянскай супольнасьці ў Беларусі".

1-2 траўня 2004 г. у Менску прайшоў **V Кангрэс** Асамблеі НДА.

{ ШТО ПІШУЦЬ СМІ }

Новыя далягляды Асамблеі

Падчас Кангрэсу адбылася сэкцыя, прысьвечаная абмеркаваньню працы ў новых умовах і альтэрнатыўным мэханізмам прызнаньня забароненых беларускіх НДА. Па яе выніках новай Рабочай групе даручана распрацаваць і зацьвердзіць мэханізм легалізацыі альбо грамадзкага прызнаньня грамадзянскіх ініцыятываў (няўрадавых арганізацыяў). Нарматыўным падмуркам гэтага мэханізму зьяўляюцца прынятыя Радай Эўропы прынцыпы вызначэньня статусу няўрадавых арганізацыяў. Прадстаўнікі міжнародных структураў, якія прысутнічалі на Кангрэсе, заявілі, што такая грамадзкая рэгістрацыя будзе прызнаная эўрапейскімі структурамі як легалізацыя беларускіх НДА.

...Удзельнікі V Кангрэсу прынялі вітальны зварот да Эўразьвязу з нагоды яго пашырэньня, Рэзалюцыю, у якой адзначаецца пагаршэньне ўмоваў існаваньня трэцяга сэктару ў Беларусі, а таксама выказваецца "рашучы пратэст супраць кампаніі рэпрэсіяў, накіраванай на структуры грамадзянскай супольнасьці і грамадзкіх актывістаў".

Удзельнікі Кангрэсу з радасьцю павіталі Рэзалюцыю Камісіі ААН па правах чалавека і зьвярнуліся да ўсіх грамадзкіх актывістаў і няўрадавых арганізацыяў Беларусі з заклікам працягваць дзейнасьць на карысьць беларускага грамадзтва дзеля пабудовы дэмакратычнай прававой дзяржавы. У Заяве V Кангрэсу выкладзеныя патрабаваньні да беларускіх уладаў спыніць перасьлед НДА і закрыць крымінальныя справы, узбуджаныя ў дачыненьні да дзеячоў трэцяга сэктару.

Радыё Рацыя

Сяргей Мацкевіч: З надзеяй глядзець у будучыню

V Кангрэс Асамблеі няўрадавых дэмакратычных арганізацыяў Беларусі абраў на пасаду старшыні Рабочай групы Сяргея Мацкевіча. Да гэтага ён выконваў абавязкі намесьніка старшыні. У інтэрвію часопісу "Асамблея" С. Мацкевіч падводзіць вынікі Кангрэсу і разважае пра пэрспэктывы разьвіцьця трэцяга сэктару.

А.Лянкевіч

Сяргей Мацкевіч нарадзіўся ў 1964 годзе. Скончыў фізычны факультэт БДУ. У грамадзкім сэктары працуе з 1996 г. Старшыня Рады грамадзкага аб'яднаньня "Цэнтар Супольнасьць". З траўня 2004 г. - старшыня Рабочай групы Асамблеі НДА.

- Спадар Мацкевіч, як Вы ацэньваеце вынікі V Кангрэсу Асамблеі НДА?

- Гэты Кангрэс прайшоў вельмі канструктыўна, не было вялікіх спрэчак, рознагалосьсяў. І вынікі - стратэгічны плян, прапановы па альтэрнатыўным прызнаньні, фондзе ўзаемадапамогі - сьведчаць пра новы ўзровень узаемаадносінаў паміж грамадзкімі арганізацыямі. У апошнія гады было шмат сумеснай працы, узьнік узаемны давер, які дазваляе з надзеяй глядзець на пэрспэктывы разьвіцьця як Асамблеі, так і ўсяго трэцяга сэктару.

- Відавочна, што ціск уладаў на НДА будзе працягвацца. Як у такой сытуацыі ацалець трэцяму сэктару, і ня проста ацалець, але і працягваць дзейнасьць?

- Думаю, што трэці сэктар трымаецца ў першую чаргу на матывацыі асобаў, а не дзяржаўных структураў. Канечне, улада магла б паспрыяць яго разьвіцьцю, але калі не - мы будзем рэалізоўваць сваё права займацца грамадзкай дзейнасьцю і безь яе дапамогі. Ня трэба зацыкліваццa на рэгістрацыі. Насамрэч усе закрытыя арганізацыі працуюць, а з судоў выходзяць з маральнай перавагай. А тое, што дзяржава больш ня можа іх кантраляваць пры дапамозе падатковай інспэкцыі, Міністэрства юстыцыі, пракуратуры, то гэта толькі вызваляе такія арганізацыі ад лішніх клопатаў. Аднак зазначу, што губляць рэгістрацыю ніводная з гэтых арганізацыяў не жадала.

- На Ваш погляд, што зьменіць у становішчы ліквідаваных і незарэгістраваных грамадзкіх арганізацыяў магчымасьць праводзіць альтэрнатыўную рэгістрацыю?

- Лепш казаць "альтэрнатыўнае прызнаньне", бо гэтая працэдура не замяняе дзяржаўную рэгістрацыю грамадзкіх аб'яднаньняў. Ідэя ў тым, каб паспрабаваць атрымаць міжнародны сэртыфікат для закрытых у Беларусі арганізацыяў, а таксама для тых, якім у рэгістра-

цыі адмовілі. Гэта праява салідарнасьці дэмакратычных краінаў, яны паказваюць, што разумеюць наша становішча і выказваюць падтрымку нашай дзейнасьці.

Вельмі важна адчуваць сябе ў эўрапейскім кантэксьце, прыстасоўваць сваю дзейнасьць да дэмакратычных стандартаў, а ня ўпіхваць яе ў штучна створаныя і, спадзяюся, часовыя межы, у якія хоча загнаць грамадзкія ініцыятывы Беларусі цяперашні рэжым. Акрамя таго, рэгістрацыя за мяжой адкрые доступ да інфармацыйных, мэтадычных і іншых рэсурсаў, якімі валодае аб'яднаная Эўропа.

- Якая самая аптымальная форма ўдзелу НДА ў будучай выбарчай кампаніі?

- Хачу яшчэ раз падкрэсьліць, што рашэньне пра ўдзел ці няўдзел прымае кожная арганізацыя самастойна. Адзін з нашых прынцыпаў - неўмяшаньне Асамблеі ў справы арганізацыяў. Тым ня менш, шмат якія грамадзкія аб'яднаньні вырашылі ўзяць удзел у выбарах. Гэта адпавядае нашаму заканадаўству. А самая аптымальная форма - значыць, самая эфэктыўная, такая форма, дзе максымальна выкарыстоўваецца патэнцыял арганізацыі і яе сябраў.

- Склад Рабочай групы на Кангрэсе быў абноўлены. Ці варта чакаць істотных зьменаў у яе функцыянаваньні?

- Мне падабаецца, у якім накірунку ідзе разьвіцьцё Асамблеі. Цяпер, калі прыняты стратэгічны плян, ёсьць на чым сканцэнтравацца. А зьмены патрэбныя ў бок функцыянальнасьці, г. зн. адказнасьці за канкрэтную працу, пра што мы шчыра казалі на Кангрэсе: месца ў Рабочай групе - не ганаровая пасада, а кавалак працы.

- Якой Вам бачыцца будучыня Асамблеі НДА?

- Асамблея сфармавалася і гатовая да дзеяньняў, так што будучыня мне бачыцца як мінімум ня шэрай: будзе пра што напісаць у мэмуарах.

Размаўляў Сяргей Клімовіч

{ ЗАЯВА V КАНГРЭСУ АСАМБЛЕІ НДА }

"Аб перасьледзе грамадзкіх актывістаў"

Мы, дэлегаты Кангрэсу, прадстаўнікі няўрадавых дэмакратычных арганізацыяў Беларусі, з трывогай і занепакоенасьцю адзначаем, што ў дадзены момант улады Беларусі ажыцьцяўляюць буйнамаштабную кампанію рэпрэсіяў супраць грамадзкіх актывістаў і сябраў няўрадавых арганізацыяў.

У 2003 і 2004 гадах улады Беларусі забаранілі дзейнасьць больш як 60-ці вядомых і аўтарытэтных няўрадавых арганізацыяў. Адначасова рэпрэсіі абрынуліся на кіраўнікоў і сябраў няўрадавых арганізацыяў і грамадзкіх ініцыятываў.

Мы расцэньваем крымінальны перасьлед кіраўніка Беларускага Хельсынскага камітэту Тацяны Процькі, кіраўніка слонімскай арганізацыі "Воля да разьвіцьця" Міхаіла Варанца, кіраўніка ГА "Дзелавая ініцыятыва" Міхаіла Марыніча, лідэра Аб'яднанай грамадзянскай партыі Анатоля Лябедзькі як палітычны перасьлед, выкліканы грамадзкай актыўнасьцю гэтых дзеячоў.

Мы лічым недапушчальнымі дзеяньні Камітэту дзяржаўнай бясьпекі і Пракуратуры Рэспублікі Беларусь, скіраваныя на шантаж і супрацьзаконнае ўзьдзеяньне на грамадзкіх актывістаў.

Мы патрабуем ад уладаў Беларусі неадкладна спыніць крымінальны перасьлед Тацяны Процькі, Міхаіла Варанца, Міхаіла Марыніча і Анатоля Лябедзькі.

Мы патрабуем ад Камітэту дзяржаўнай бясьпекі, Пракуратуры Рэспублікі Беларусь і іншых дзяржаўных органаў спыніць неабгрунтаваны і незаконны ціск на беларускіх грамадзкіх актывістаў.

Мы патрабуем зьняць з пасадаў тых службовых асобаў, што спрычыніліся да палітычных рэпрэсіяў супраць няўрадавых арганізацыяў і іх сябраў.

{ ШТО ПІШУЦЬ СМІ }

Асамблея закрытых арганізацыяў

На сьвята салідарнасьці працоўных у Менску адбыўся V Кангрэс Асамблеі дэмакратычных няўрадавых арганізацыяў Беларусі. Пра сытуацыю ў сэктары красамоўна сьведчыць той факт, што за два гады ад папярэдняга кангрэсу ўлады закрылі 55 арганізацыяў.

Наша Ніва

Праца на пэрспэктыву

Новым старшынём рабочай групы Асамблеі, якая дагэтуль не зарэгістраваная ўладамі, абраны кіраўнік цэнтру "Супольнасьць" Сяргей Мацкевіч. Ён зьмяніў на гэтай пасадзе кіраўніка "Вясны" Алеся Бяляцкага, які ўзначальваў Асамблею два тэрміны. Пасьля абраньня С. Мацкевіч сказаў, што галоўнай яго задачай на пасадзе кіраўніка рабочай групы будзе выкананьне прынятага дэлегатамі Кангрэсу стратэгічнага пляну разьвіцьця Асамблеі НДА на пэрспэктыву.

У рэзалюцыі дэлегаты Кангрэсу заклікаюць усіх грамадзкіх актывістаў і няўрадавыя арганізацыі Беларусі нягледзячы на рэпрэсіі з боку ўладаў працягваць дзейнасьць на карысьць пабудовы дэмакратычнай і прававой дзяржавы. Кангрэс таксама патрабуе ад уладаў неадкладна спыніць крымінальны перасьлед вядомых грамадзкіх дзеячоў Тацяны Процькі, Анатоля Лябедзькі і Міхаіла Варанца.

Дэлегаты павіншавалі ўрады і народы краінаў - новых сябраў Эўразьвязу - і падкрэсьлілі, што грамадзянская супольнасьць Беларусі таксама бачыць сваю краіну ў будучыні сябрам эўрапейскай супольнасьці.

Радыё Свабода

Справаздачны выступ Алеся Бяляцкага

Добры дзень, шаноўныя сябры!

Мы з вамі сабраліся ў вельмі няпросты час. У Беларусі ідзе сапраўдны разгром няўрадавых арганізацыяў, якія адна за адной пазбаўляюцца магчымасьці легальна дзейнічаць. Міністэрства юстыцыі, як той чарнасоценец, махае дубінаю налева і направа, разбураючы ўсё тое, што было набудавана беларускім грамадзтвам за апошнія 10 гадоў, і паставіўшы за мэту загнаць нас у падпольле. Не сакрэт, што ўсё гэта адбываецца ў шчыльнай зьвязцы з закрыцьцём незалежных газэтаў і цкаваньнем журналістаў, зьнішчэньнем незалежных прафсаюзаў, рэзкім абмежаваньнем дзейнасьці палітычных партыяў, узмацненьнем кантролю над недзяржаўнай адукацыяй, арыштамі вядомых грамадзкіх дзеячоў, суткамі і вялізнымі штрафамі, узбуджэньнем новых крымінальных справаў супраць нашых сябраў - прадстаўнікоў няўрадавых арганізацыяў, супраць палітычных дзеячоў і журналістаў. Дадамо сюды адраджэньне дзяржаўнай ідэалёгіі, адкрытую падтрымку GONGO (праўрадавых няўрадавых арганізацыяў), прыгонную па сутнасьці кантрактную сыстэму, якая скрозь уводзіцца зараз для працоўных.

Як пісаў у свой час адзін беларускі пісьменьнік - "цёмныя хмары прыгнёту плывуць над Беларусьсю". Чаму ж так адбываецца?

Я мяркую, што беларускія ўлады і Лукашэнка, якім доўгі час удавалася праз розныя палітычныя фокусы мець падтрымку большасьці беларускага народу, зараз імкліва губляюць гэтую падтрымку. Ім усё цяжэй кантраляваць сытуацыю, і гэтая істэрыя - паказчык слабасьці. Я ўзгадваю штосьці падобнае ў часы Андропава. Улады дзейнічаюць па законах разьвіцьця таталітарнага грамадзтва - зьнішчаюць усё тое, што не

знаходзіцца пад іх кантролем, спрабуючы ўтрымацца.

Вось у такіх умовах праходзіла наша праца ў апошнія гады. Мы вымушаныя былі апэратыўна адказваць, як зараз кажуць, на выклікі нашага беларускага часу, які ў нас круціцца, на жаль, зусім у іншы бок у параўнаньні з часам эўрапейскім.

Тым ня менш, азіраючыся назад, нават са зьдзіўленьнем і задавальненьнем хачу адзначыць, што вось такія экстрэмальныя ўмовы ўзмацнілі нашу працу! За гэтыя два гады супольнымі намаганьнямі мы зрабілі ня меней, а можа нават і болей, чым раней. За гэты час пад эгідай Асамблеі НДА ў нас прайшло некалькі агульнанацыянальных кампаніяў, ініцыяваных няўрадавымі арганізацыямі.

Узгадаю кампанію "Зробім лепш!", якая праходзіла ўлетку 2002 і ўвесну 2003 году. Удзел у ёй узялі больш за сто НДА. Яна была накіраваная на набліжэньне НДА да мясцовых праблемаў, на наладжваньне кантактаў зь мясцовым кіраўніцтвам, зь людзьмі канкрэтных мястэчак і гарадоў. Мы працягнулі руку мясцовым выканаўчым уладам, мы паказалі і людзям, і мясцовым уладам, у чым карысьць НДА, дзеля чаго яны існуюць, што яны робяць. Гэтая кампанія была пэўнай школай для некаторых грамадзкіх дзеячоў, якія пасьля ўвесну 2003 году пайшлі на выбары і сталі дэпутатамі мясцовых Саветаў.

Асабліва актуальнай у 2003 і гэтым годзе была і ёсьць кампанія "Наша салідарнасьць". У межах гэтай кампаніі былі праведзеныя грамадзкія слуханьні з удзелам чыноўнікаў Міністэрства юстыцыі, прынятыя калектыўныя звароты ад НДА з патрабаваньнем спыніць разгром трэцяга сэктару ў Беларусі, праведзена дэманстратыўнае мерапрыемства каля будынка Мінюста. Наладжана прафэсійная абарона інтарэсаў грамадзкіх арганізацыяў у судах, актыўна распаўсюджвалася інфармацыя пра парушэньні нашых правоў, што выклікала адпаведную рэакцыю ў міжнароднай супольнасьці.

Пытаньне пра незаконнае закрыцьцё НДА адзначаецца ў апошняй рэзалюцыі па Беларусі, прынятай у гэтым месяцы Камісіяй па правах чалавека ААН у Жэневе. Міжнародная супольнасьць патрабуе аднавіць рэгістрацыю закрытых уладамі арганізацыяў, гэтага ж настойліва патрабуем і мы. Самае істотнае, чаго мы дамагліся - гэта тое, што НДА, якія перасьледуюцца, не засталіся сам-насам са сваімі праблемамі. Яны атрымалі рэальную падтрымку і дапамогу ад усіх нас.

У рамках гэтай кампаніі ўзьнікла ідэя: згодна з нормамі міжнароднага заканадаўства арганізаваць альтэрнатыўную рэгістрацыю няўрадавых арганізацыяў за межамі Беларусі, якая б давала законныя паўнамоцтвы беларускім НДА быць цалкам легі-

тымнымі калі ня тут, у сябе на Радзіме, то ў стасунках з усімі іншымі суб'ектамі міжнароднага жыцьця. Гэтае пытаньне мы павінны будзем абмеркаваць тут, на нашым Форуме, і прыняць адпаведнае рашэньне.

Асамблея спрычынілася да працы грамадзянскай ініцыятывы "За свабоднае веравызнаньне", арганізаваўшы абмеркаваньне новага закону аб рэлігіях, якое паказала дыскрымінацыйную сутнасьць гэтага закону, што абмяжоўвае правы некаторых рэлігійных канфэсіяў у Беларусі, а іншым надае неабгрунтавана большыя правы.

Згодна з рашэньнямі мінулага Кангрэсу, асабліва актыўна ў апошні год вялася праца па распрацоўцы стратэгічнага пляну разьвіцьця Асамблеі. У гэты працэс былі ўцягнутыя ўсе ахвочыя - дзясяткі няўрадавых арганізацыяў Беларусі. Летась па стратэгічным плянаваньні ў нас быў праведзены трохдзённы сэмінар пад Менскам, затым плённа працавала група па стратэгічным плянаваньні. Сёлета ў кожнай вобласьці былі праведзеныя прэзэнтацыі гэтага стратэгічнага пляну, напрацаванага самімі НДА, дзе ўносіліся заўвагі, шмат якія таксама былі ўлічаныя. У тым і каштоўнасьць нашага стратэгічнага пляну, што ён стаўся калектыўным прадуктам рэальных плянаў і рэальных магчымасьцяў нашых арганізацыяў. І таму ён сапраўды можа быць выкананы, калі мы з вамі прымем яго, у адрозьненьне ад чыста тэарэтычных, нерэальных для выкананьня іншых напрацовак.

Яшчэ адно рашэньне мінулага Форуму - рэгістрацыя Асамблеі НДА - на жаль, не было выкананае па незалежных ад нас прычынах. У сьнежні мінулага году Мінюст пасьля паўтарагадовага разгляду дакумэнтаў на падставе рашэньня камісіі па рэгістрацыі адмовіў у рэгістрацыі Асамблеі.

Сталае месца ў асьвятленьні працы НДА ў Беларусі заняў часопіс "Асамблея" - адзінае выданьне падобнага накірунку, якое моцна дапамагае няўрадавым арганізацыям у атрыманьні інфармацыі пра разьвіцьцё трэцяга сэктару ў Беларусі, дапамагае ў абмене думкамі і вопытам існаваньня, а таксама вэб-сайт Асамблеі, які актыўна запрацаваў у апошні год і зьяўляецца крыніцай бягучай інфармацыі пра трэці сэктар у Беларусі.

Я хацеў бы таксама адзначыць зладжаную працу Выканаўчага бюро Асамблеі, якое ў нашых умовах сталася сапраўдным арганізацыйным цэнтрам НДА, інструмэнтам, які дапамагаў аб'яднаць намаганьні сябраў Асамблеі па самых розных пытаньнях. Усе праграмы Выканаўчага бюро Асамблеі былі накіраваныя на ўзмацненьне аўтарытэту НДА ў беларускім грамадзтве і за мяжой, на большую эфэктыўнасьць і плённасьць нашай працы.

Можа, ніколі ў будучыні наша праца ня будзе такой важнай і неабходнай для беларускага грамадзтва, як цяпер.

Адкрытасьць у працы Рабочай групы значна павялічыла дэмакратызм абмеркаваньня рашэньняў, якія прымаліся Рабочай групай за апошні час, плюралізм думак, павагу да розных меркаваньняў у асяродзьдзі няўрадавых арганізацыяў. Да працы Асамблеі праз агульнанацыянальныя кампаніі, галіновыя круглыя сталы, іншыя сумесныя праекты далучылася шырокае кола арганізацыяў. І гэта - паказчык нашай стабільнасьці, дэмакратызму, унутранай павагі аднаго да аднаго.

Вядома, у нас ня ўсё было так проста і добра, як хацелася б. Мы павінны аптымізаваць працу Рабочай групы, зрабіць яе больш эфэктыўнай і выніковай. Спадзяюся, што гэтаму паспрыяюць новыя сябры Рабочай групы, новае кіраўніцтва Асамблеі.

У нас амаль не працуюць абласныя асамблеі, якія на добры лад павінны былі б мець уласныя пляны разьвіцьця трэцяга сэктару ў сваіх рэгіёнах.

Мы павінны дбаць пра новыя нацыянальныя праграмы, якія аб'ядноўвалі б НДА па інтарэсах і дапамагалі б разьвіваць рэгіянальнае і галіновае супрацоўніцтва. Бо рэальна выжыць і перамагчы ў адстойваньні сваіх інтарэсаў, інтарэсаў беларускай грамадзянскай супольнасьці мы зможам толькі працуючы разам. Перакананы, толькі тады мы, як тыя пруткі, зьвязаныя ў адзін венік, ня толькі не дамо, каб нас зламалі кожнага паасобку, але і здолеем вымесьці ўсялякі бруд з нашага панадворку. Мы ўсе разам павінны і надалей працаваць на станоўчы імідж Асамблеі НДА, мацуючы яго плённасьцю сваёй працы, тады і гэты імідж будзе працаваць на ўсіх нас. Спадзяюся, што сёньня і заўтра мы падрабязна абгаворым шляхі нашага далейшага разьвіцьця.

Мы з вамі, сябры, апынуліся ў вельмі цікавай сытуацыі, калі адчуваем, што наша праца запатрабаваная як ніколі. Можа, ніколі ў будучыні наша праца ня будзе такой важнай і неабходнай для беларускага грамадзтва, як цяпер, у гэтыя гады. Сёньня - сьвяточны дзень для будучай Эўропы, якая папоўнілася дзесяцьцю новымі краінамі, тры зь якіх - нашы бліжэйшыя суседзі. Межы Эўразьвязу цяпер праходзяць за 150 кілямэтраў ад Менску. Давайце павіншуем прадстаўнікоў гэтых краінаў, якія знаходзяцца сёньня тут - разам з намі. Іх прысутнасьць тут і зараз для нас найбольшая прыкмета таго, што яны сапраўды заклапочаныя нашым лёсам і сапраўды жадаюць шчыра дапамагчы нам. Гэтыя краіны паказалі шлях, па якім неўзабаве ісьці і нам. Ідэя Эўрапейскага дому, дому, дзе разьвітая эканоміка, дзе высокая бясьпека, дзе ёсьць павага да правоў чалавека, дзе ёсьць месца для разьвіцьця ўсіх нацыянальных культураў, дзе таксама чакаюць і Беларусь, дзе зарэзэрвавана месца і нам, дзе нам, усяму беларускаму народу, будзе жыць лепей - гэта наша ідэя, дзеля прапаганды і прасоўваньня якой павінны працаваць у бліжэйшыя часы ўсе мы.

Дык давайце ж не апускаць рукі, не зьнявервацца і не пасыпаць галовы попелам, давайце працаваць і натхняць на працу іншых!

Жыве Беларусь!

Г.Лабадзенка

Многія грамадзкія арганізацыі прэзэнтавалі сваю дзейнасьць на адмысловых стэндах.

{ ШТО ПІШУЦЬ СМІ }

Не зарэгіструюць, дык хаця б прызнаюць

Чарговы, V Кангрэс незарэгістраванай Асамблеі няўрадавых арганізацыяў Беларусі, які адбыўся ў Менску, паклікаў да жыцьця некалькі крэатыўных рашэньняў. Па-першае, была прынятая рэзалюцыя пра ўдзел арганізацыяў "трэцяга сэктару" ў выбарах (насамрэч Кангрэс прыняў рэкамэндацыі для НДА і грамадзкіх актывістаў па магчымых формах удзелу ў выбарах - **"Асамблея"**). Раней ад такіх рашэньняў няўрадавыя арганізацыі хаця б зьнешне дыстанцыяваліся. Па-другое, было абвешчана пра пачатак працэдуры т. зв. "альтэрнатыўнага прызнаньня", якая будзе ўжывацца да арганізацыяў, што страцілі афіцыйны, зарэгістраваны статус, альбо да тых, якім было адмоўлена ў рэгістрацыі.

Нарматыўнай падставай такога мэханізму зьяўляюцца прынятыя Радай Эўропы прынцыпы вызначэньня статусу недзяржаўных арганізацыяў. Гэта значыць, што беларуская арганізацыя можа быць зарэгістраваная ў любой з эўрапейскіх краінаў, бо там існуюць агульныя крытэрыі для рэгістрацыі НДА і яны нашмат больш лібэральныя, чым беларускае заканадаўства.

БДГ

Алесь Бяляцкі

Ірына Жыхар

Віталь Васількоў

Барыс Звоскаў

Прадстаўляем намесьнікаў старшыні Рабочай групы

Вацлаў Арэшка

Вацлаў Арэшка нарадзіўся ў 1955 г. Скончыў Беларускую акадэмію мастацтваў. У палітыцы - з 1988 г., прафэсійна працуе ў трэцім сэктары з 1996 г. Сябра Рады ГА "Дыярыюш", сябра Сойму Партыі БНФ. Адказвае за камунікацыю і імідж Асамблеі НДА Беларусі.

В. Арэшка: "На бліжэйшыя паўгода праца будзе цесна зьвязаная з палітычнай сытуацыяй у краіне і з тым, як трэці сэктар будзе адносна яе пазыцыянавацца".

Алесь Бяляцкі нарадзіўся ў 1962 г. Скончыў Гомельскі ўнівэрсытэт. Удзельнік беларускага незалежніцкага руху з пачатку 1980-х, адзін з заснавальнікаў БНФ "Адраджэньне". Кіраўнік праваабарончага цэнтру "Вясна". У 2000-2004 гг. зьяўляўся старшынём Рабочай групы Асамблеі НДА Беларусі. Адказвае за пытаньні альтэрнатыўнага прызнаньня НДА і абарону іх правоў.

Віталь Васількоў нарадзіўся ў 1962 г. Працаваў у Магілёве журналістам, рэдактарам, быў дэпутатам мясцовага і абласнога Саветаў. З 1995 г. - у трэцім сэктары, адзін з заснавальнікаў магілёўскага "Кола сяброў", у цяперашні час - старшыня фонду "Садзейнічаньне ўстойліваму разьвіцьцю". Адказвае за працу з рэгіёнамі.

В. Васількоў: "На мяне ўскладзеныя абавязкі рэгіянальнага каардынатара, каардынатара рэгіянальных асамблеяў і ўсяго, што з гэтым зьвязана. У бліжэйшы час паспрабуем высьветліць, колькі нас, хто мы і што мы".

Ірына Жыхар скончыла хімфак БДУ. У грамадзкім руху з 1994 г. У цяперашні час - намесьнік старшыні Рады ГА "Беларуская арганізацыя працоўных жанчын". Адказвае за арганізацыйнае разьвіцьцё і стратэгічнае плянаваньне Асамблеі НДА Беларусі.

І. Жыхар: "Я ўзяла на сябе адказнасьць за дапрацоўку стратэгічных задачаў і распрацоўку мерапрыемстваў у Рабочы плян на бліжэйшы год менавіта па арганізацыйным разьвіцьці сябраў Асамблеі. Акрамя таго, я адказваю за распрацоўку мерапрыемстваў, якія датычацца практыкі шырокага абмеркаваньня актуальных для грамадзтва і НДА праблемаў і шляхоў іх вырашэньня".

Барыс Звоскаў нарадзіўся ў 1949 г. Выпускнік Вышэйшага курсу па абароне правоў чалавека ў Варшаве. Праваабарончай дзейнасьцю займаецца з 1996 г. Намесьнік старшыні Рады РГА "Хельсынкі-XXI". Адказвае за пытаньні альтэрнатыўнага прызнаньня НДА і абарону іх правоў.

Б. Звоскаў: "Важная задача - прасоўваць у Беларусі эўрапейскія стандарты ў галіне правоў чалавека. Мы - у Эўропе, і мы мусім гаварыць зь ёю на адной мове".

Здымкі А.Лянкевіча

Сэкцыі

Выніковыя рэкамэндацыі

ПРАЦА Ў НОВЫХ УМОВАХ: АЛЬТЭРНАТЫЎНАЯ РЭГІСТРАЦЫЯ

На сёньняшні дзень у Беларусі склаўся неспрыяльны палітыка-прававы клімат для існаваньня няўрадавых арганізацыяў. Практыка неправавой ліквідацыі (забароны дзейнасьці) грамадзкіх аб'яднаньняў і беспадстаўнай нерэгістрацыі няўрадавых арганізацыяў прывяла да таго, што значная частка арганізацыяў беларускага трэцяга сэктару працуе без дзяржаўнай рэгістрацыі, гэта значыць - у нелегальным стане. Фактычна трэці сэктар у тым выглядзе, у якім ён існаваў у краіне з 1996 году, перастаў існаваць - дзяржаўная рэгістрацыя канчаткова страціла характар фіксацыі існаваньня няўрадавых арганізацыяў і ператварылася ў сродак разьдзяленьня арганізацыяў на "непажаданыя" і "прыймальныя".

У гэтых умовах няўрадавыя арганізацыі, што страцілі рэгістрацыю альбо ня здолелі яе атрымаць, сутыкаюцца з дадатковымі праблемамі ў сваёй дзейнасьці. Найперш гаворка ідзе пра немагчымасьць фармалізаваць існаваньне няўрадавай арганізацыі, даказаць яго рэальнасьць. Аднак адсутнасьць дзяржаўнай рэгістрацыі не павінна ўплываць на прызнаньне арганізацыі. Таму ў сёньняшніх умовах паўстае неабходнасьць распрацоўкі мэханізму грамадзкага прызнаньня беларускіх НДА незалежна ад наяўнасьці ў іх дзяржаўнай рэгістрацыі. Гэта і стала асноўнай тэмай, якая была абмеркаваная падчас пасяджэньня сэкцыі "Праца ў новых умовах: альтэрнатыўная рэгістрацыя".

У працы сэкцыі ўзяў удзел 41 прадстаўнік зарэгістраваных і незарэгістраваных арганізацыяў нацыянальнага і рэгіянальнага ўзроўню, арганізацыяў, што былі забароненыя ў 2003 і 2004 гадах, а таксама замежных НДА.

Выніковыя рэкамэндацыі сэкцыі

На падставе меркаваньняў, выказаных удзельнікамі сэкцыі "Праца ў новых умовах: альтэрнатыўная рэгістрацыя" V Кангрэсу Асамблеі дэмакратычных арганізацыяў, абапіраючыся на відавочную патрэбу ў стварэньні мэханізму грамадзкага прызнаньня беларускіх грамадзянскіх ініцыятываў (няўрадавых арганізацыяў), аддзяляючы "Асноватворныя прынцыпы статусу няўрадавых арганізацыяў у Эўропе", прызнаючы права кожнага на свабоду асацыяцыяў незалежна ад дзяржаўнай рэгістрацыі ў якасьці грамадзкага аб'яднаньня, маючы за мэту падтрымаць, захаваць і разьвіць нацыянальны сэктар грамадзянскіх ініцыятываў,

рэкамэндаваць Рабочай групе Асамблеі:

— Працягнуць выпрацоўку мэханізму "грамадзкага прызнаньня" (альтэрнатыўнай рэгістрацыі) беларускіх грамадзянскіх ініцыятываў (няўрадавых арганізацыяў) з наступным удакладненьнем самога тэрміну.

— Сфармаваць самастойны грамадзкі калегіяльны орган у складзе аўтарытэтных грамадзкіх дзеячоў, аддзяліўшы яго ад Рабочай групы Асамблеі.

— Распрацаваць працэдуру функцыянаваньня і прыняцьця рашэньняў грамадзкага калегіяльнага органа і працэдуру звароту (заявы аб прызнаньні) у яго зацікаўленых асобаў.

— Зрабіць крокі да легалізацыі дзейнасьці дадзенага грамадзкага органа (па пошуку шляхоў грамадзкага прызнаньня) беларускіх грамадзянскіх ініцыятываў за межамі Беларусі з магчымай выдачай сэртыфікату прызнаньня.

— Правесьці абмеркаваньне выпрацаванага мэханізму і дакумэнтаў сярод прадстаўнікоў беларускіх грамадзкіх аб'яднаньняў.

ЗЬНЕШНІЯ СУВЯЗІ АСАМБЛЕІ

Галоўнай мэтай працы сэкцыі "Зьнешнія сувязі Асамблеі" была выпрацоўка асноўных падыходаў арганізацыяў - сябраў Асамблеі да пабудовы ўзаемаадносінаў з рознымі зьнешнімі ў адносінах да Асамблеі структурамі: іншымі НДА, у тым ліку прадзяржаўнымі, міжнароднымі і замежнымі арганізацыямі (донарамі і партнэрамі), сродкамі масавай інфармацыі, мясцовай уладай, заканадаўчай уладай і, па магчымасьці, бізнэсам. На сэкцыі ўсе гэтыя пытаньні абмяркоўваліся пасьлядоўна.

Перш за ўсё вызначалася неабходнасьць такіх узаемаадносінаў, асноўныя праблемныя аспэкты, існуючыя магчымасьці для супрацоўніцтва альбо хаця б для рэгулярнай камунікацыі з гэтымі сэктарамі ці структурамі. Таксама прапаноўваліся рэкамэндацыі, якія маглі б легчы ў аснову палітыкі Асамблеі ў сфэры зьнешніх сувязяў.

Адзін са складаных момантаў - сувязі з замежжам. Прычым ня столькі ў пляне пошуку фінансаваньня, колькі ў пытаньні на-

ладжваньня трывалых адносінаў. Замежныя арганізацыі і фонды недастаткова інфармаваныя пра тое, што адбываецца ў Беларусі. І Асамблея як найбуйнейшая парасонавая структура НДА Беларусі магла б зьмяніць сытуацыю да лепшага.

У сэкцыі ўзялі ўдзел 42 чалавекі. Асноўныя пытаньні, якія яны абмяркоўвалі:

- Пытаньне супрацоўніцтва зь іншымі НДА ўдзельнікі палічылі вельмі актуальным, аднак напачатку праявілася тэндэнцыя атаясамліваць супрацоўніцтва зь іншымі НДА зь іх сяброўствам у Асамблеі. Гэта значыць, асноўнай мэтай супрацоўніцтва многія ўдзельнікі лічылі прыцягненьне іншых НДА ў Асамблею, а не дасягненьне якіх-небудзь зьменаў у грамадзтве сумеснымі намаганьнямі.

- Вельмі востра стаяла пытаньне, наколькі ўвогуле дапушчальнае супрацоўніцтва з арганізацыямі, якія, па меркаваньнях удзельнікаў сэкцыі, не зьяўляюцца дэмакратычнымі. Было прапанавана вызначыць крытэрыі дэмакратычнасьці. Зь іх былі названыя: выбарнасьць кіраўніцтва зьнізу, незалежнасьць ад улады ў прыняцьці рашэньняў, а таксама (крыху пазьней) зьмест місіі, мэтаў і задачаў арганізацыяў, характар ужываных мэтадаў працы. У гэтай сувязі дыскусія напачатку засяродзілася на праблеме дапушчальнасьці супрацоўніцтва з такімі структурамі, як БРСМ. Акрамя таго, не заўсёды выразна праводзілася мяжа паміж супрацоўніцтвам "Асамблея - іншыя НДА" і "сябры Асамблеі - іншыя НДА". Некаторыя ўдзельнікі высоўвалі патрабаваньне да ўсіх сябраў Асамблеі прытрымлівацца тых жа крытэрыяў супрацоўніцтва зь іншымі НДА, што і Асамблея ў цэлым.

Вызначыліся два падыходы да такога супрацоўніцтва: жорсткі варыянт, калі пытаньне ставіцца па прынцыпе "хто ня з намі, той супраць нас", і нават тыя арганізацыі, якія проста асьцерагаюцца ўступаць у Асамблею з-за яе статусу і мэтаў, што яна дэкляруе, ня лічацца магчымымі партнэрамі; мяккі варыянт, калі ў якасьці мэты дзейнасьці Асамблеі прапануецца прыцягненьне іншых арганізацыяў сваім станоўчым прыкладам і супрацоўніцтва там, дзе ёсьць узаемная зацікаўленасьць, для дасягненьня якіх-небудзь грамадзкіх зьменаў. Прычым тут магчымае таксама супрацоўніцтва зь нізавымі структурамі БРСМ і г. д., а таксама зь сябрамі гэтых арганізацыяў. Па дадзеным пытаньні меркаваньні разьдзяліліся, і рэкамэндацыі мелі супрацьлеглы характар.

Г.Лабадзенка

Валер Шчукін актыўна ўдзельгічаў у абмеркаваньнях.

- Асабліва падкрэсьлівалася важнасьць вырашэньня пытаньня міжнароднага прызнаньня, узаемадзеяньня, зносінаў зь беларускімі НДА, якія пазбавіліся рэгістрацыі. Сярод прапановаў па працы зь міжнароднымі арганізацыямі былі наступныя: больш шчыльна кантактаваць з Камісіяй па правах чалавека ААН у Жэневе па ўсіх магчымых пытаньнях, кантактаваць са спэцдакладчыкам Камісіі ААН, шырока інфармаваць эўрапейскія структуры наконт таго, што адбываецца ўнутры Беларусі, дэлегаваць паўнамоцтвы Асамблеі ад НДА - яе сябраў, каб даносіць інфармацыю да міжнародных структураў пра мерапрыемствы беларускіх ГА ды інш.

- Важным зьяўляецца адукацыйная і асьветніцкая дзейнасьць Асамблеі з мэтай павышэньня ўзроўню ўдзельнікаў сэкцыі па пытаньнях міжнароднага супрацоўніцтва і міжнароднай дапамогі для будучых зносінаў з донарскімі і партнэрскімі арганізацыямі. Асабліва гэта датычыцца правінцыйных арганізацыяў і некаторых філіяў рэспубліканскіх арганізацыяў.

- Пытаньні супрацоўніцтва з уладай на мясцовым узроўні выклікалі значна большую цікавасьць удзельнікаў і ўсьведамленьне неабходнасьці такога ўзаемадзеяньня і супрацоўніцтва, чым праца з дэпутатамі заканадаўчай улады. Удзельнікі выказалі вельмі няшмат ідэяў наконт таго, навошта патрэбнае супрацоўніцтва з Парлямэнтам і як можна яго зьдзяйсьняць. Гэта абумоўліваецца і нелегальным статусам Асамблеі, і нявер'ем у магчымасьці Парлямэнту наагул уплываць на сытуацыю ў краіне. Пытаньне ўвесь час упіралася ў рашэньне наконт удзелу альбо няўдзелу ў выбарах. Аднак шэраг прапановаў усё ж такі быў выказаны.

- Супрацоўніцтва зь мясцовай уладай - пытаньне, выкліканае скрайней неабходнасьцю, пачынаючы ад рэгістрацыі і да рэалізацыі

праектаў ды праграмаў. Праблема адносінаў і ўзаемадзеяньня зь мясцовай уладай (асабліва выканаўчай) выходзіць на першы плян у дзейнасьці любой арганізацыі. Ёсьць вострая неабходнасьць у пашырэньні досьведу і дыяпазону магчымых рашэньняў для НДА - сябраў Асамблеі. Гэта можна рабіць і шляхам інфармаваньня, і навучаньня канкрэтным тэхналёгіям і мэтодыкам працы.

- Праца са СМІ. Дыскусія ў дадзенай частцы сэкцыі будавалася ў асноўным на дыялёгу паміж прэс-сакратаром Асамблеі і журналістамі, таксама было шмат пытаньняў з боку ўдзельнікаў і, адпаведна, шмат рэкамэндацыяў. Усё ж асноўнай праблемай застаецца прасоўваньне дзейнасьці незарэгістраваных арганізацыяў, але таксама і ўменьне рэклямаваць, падаваць станоўчы досьвед і карысьць арганізацыяў трэцяга сэктару.

У цэлым сэкцыя працавала вельмі інтэнсіўна, але варта было б усё ж зьменшыць колькасьць пытаньняў, што абмяркоўваюцца адначасова. Некаторыя рэкамэндацыі, прапанаваныя ўдзельнікамі, маюць супрацьлеглы характар і патрабуюць прыняцьця прынцыповых палітычных рашэньняў Асамблеі (напрыклад, па пытаньнях супрацоўніцтва з залежнымі і напаўдзяржаўнымі структурамі, а таксама з НДА, якія не жадаюць уступаць у Асамблею па самых розных прычынах). Некаторыя могуць заставацца на ўзроўні рэкамэндацыяў, і рашэньне па іх носіць тактычны характар (напрыклад, якім чынам арганізоўваць распаўсюд інфармацыі пра незарэгістраваную структуру).

СТРАТЭГІЧНЫ ПЛЯН АСАМБЛЕІ Ў КАНТЭКСЬЦЕ РАЗЬВІЦЬЦЯ НАЦЫЯНАЛЬНАГА ТРЭЦЯГА СЭКТАРУ

У сэмінарах-прэзэнтацыях draft-варыянту стратэгічнага пляну ў рэгіёнах узялі ўдзел больш за 160 чалавек. Пасьля збору заўвагаў і прапановаў на Кангрэсе быў прэзэнтаваны ўзгоднены варыянт стратэгічнага пляну. Тым ня менш, было вельмі важна, каб гэты прадукт быў прыняты большасьцю арганізацыяў як свой, а ня штучна створаны нейкай групай.

Таму галоўнай мэтай сэкцыі было далучэньне арганізацыяў да працэсу распрацоўкі стратэгічнага пляну Асамблеі праз пошук адказаў на наступныя пытаньні:

- Ці ёсьць прынцыповыя заўвагі да стратэгічнага пляну?
- Наколькі плян рэальны?
- Ці ёсьць месца для вашай арганізацыі ў рэалізацыі стратэгічнага пляну?

У працы сэкцыі ўзялі ўдзел 37 чалавек. Першапачаткова было прапанавана суаднесьці місію (ці галоўную мэту дзейнасьці) сваёй арганізацыі зь місіяй Асамблеі - спрыяе ці не місія Асамблеі выкананьню місіі арганізацыі. Паказальна, што ўсе без выключэньня адзначылі пазытыўнасьць місіі і мэтаў Асамблеі для сваёй арганізацыі. Гарачыя спрэчкі разгарэліся вакол фармулёўкі місіі Асамблеі, бо ў працэсе абмеркаваньня былі прапанаваныя шэсьць яе варыянтаў, якія па-рознаму ставілі акцэнты.

Далей пасьлядоўна абмяркоўваліся элемэнты стратэгічнага пляну: вызначэньне Асамблеі, яе місія, каштоўнасьці, арганізацыйныя прынцыпы, галоўныя мэты, задачы і крытэрыі ацэнкі дасягненьня посьпеху.

Улічваючы, што стратэгічнае плянаваньне зьяўляецца працэсам пэрманэнтным, удзельнікі сэкцыі прыйшлі да высновы, што на цяперашнім этапе прапанаваная групай місія Асамблеі найбольш адпавядае патрэбам грамадзкіх арганізацыяў. Было прапанавана дапрацаваць задачы па стварэньні ўмоваў для арганізацыйнага разьвіцьця сябраў Асамблеі, а таксама па сталым функцыянаваньні сыстэмы маніторынгу, аналізу і ацэнкі дзейнасьці грамадзкага сэктару на канфэрэнцыі з удзелам экспэртаў па арганізацыйным разьвіцьці, іншых экспэртаў і зацікаўленых сябраў.

Прапановы па стратэгічным пляне:

1. Прыняць стратэгічны плян разьвіцьця Асамблеі.
2. Працягнуць працу па стратэгічным плянаваньні.

*Запрасіць далучыцца да групы плянаваньня зацікаўленыя арганізацыі.

*Дапрацаваць задачы шляхам правядзеньня круглых сталоў з удзелам экспэртаў.

*Распрацаваць рабочы плян на бліжэйшы пэрыяд.

*Прапанаваць мэханізм далучэньня сябраў Асамблеі да рэалізацыі стратэгічнага пляну.

Г.Лабадзенка

УДЗЕЛ НДА Ў ВЫБАРЧАЙ КАМПАНІІ 2004 ГОДУ

У сэкцыі ўзялі ўдзел больш за 60 дэлегатаў і гасьцей Кангрэсу. Вялікай дыскусіі наконт удзелу НДА ў мабілізацыйнай кампаніі і кантролі за выбарамі не атрымалася. Большасьць арганізацыяў - сябраў Асамблеі пагадзіліся зь неабходнасьцю супрацоўніцтва з палітычнымі структурамі ў будучай выбарчай кампаніі. Падчас пасяджэньня сэкцыі адзначалася, што сытуацыя ў грамадзтве зьмяняецца ў лепшы бок, большасьць грамадзянаў не падтрымліваюць рэжым. За апошнія два гады ў сьвядомасьці нашага грамадзтва адбыліся незваротныя зьмены - пераважная большасьць насельніцтва стабільна не задаволена сытуацыяй і гатовая для пераменаў. Але разьяднанасьць апазыцыі - адна з асноўных прычынаў яе слабой падтрымкі ў грамадзтве. Таму толькі аб'яднаньне рэальных і дзеяздольных палітычных і грамадзкіх сілаў можа зьмяніць сытуацыю ў нашай краіне, паспрыяць пабудове прававой, дэмакратычнай, незалежнай і заможнай Беларусі.

Практыка апошніх гадоў паказала, што пасіўнасьць не абараняе ад рэпрэсіяў рэжыму. Таму трэці сэктар мусіць кансалідаваць усе чалавечыя, арганізацыйныя і творчыя рэсурсы, каб актыўна дапамагаць палітычным арганізацыям і кандыдатам мабілізаваць грамадзтва. Досьвед такой працы ў розных накірунках у трэцяга сэктару ёсьць, ён валодае каналамі інфармацыі і ўплыву на людзей.

Формы ўдзелу:

- як юрыдычныя асобы (магчымасьці ўдзелу абмежаваныя. Верагодна, легальна выступяць апошнія зарэгістраваныя праваабарончыя арганізацыі альбо арганізацыі сацыяльнага накірунку, якія змогуць узяць удзел у сацыяльных кампаніях);

- як фізычныя асобы (бо ўсе легальныя магчымасьці ўдзелу перакрытыя ўладамі - рэжым заганяе трэці сэктар у такія рамкі).

Віды ўдзелу:

- юрыдычнае суправаджэньне выбараў;
- інфармацыйная дзейнасьць;
- адукацыйная дапамога;
- праца з выбарчымі камісіямі;
- назіраньне і маніторынг выбарчага працэсу;
- "прыйдзі і прагаласуй";
- сацыяльныя кампаніі;
- удзел у камандах кандыдатаў;
- фонд узаемадапамогі (яго ідэя зьвязана з удзелам у выбарах шараговых актывістаў, грамадзкіх арганізацыяў і магчымымі рэпрэсіямі з боку ўладаў (звальненьні з працы, штрафы, суды і г. д.). Маецца на ўвазе стварэньне адзінай каардынацыйнай сыстэмы дапамогі, пачынаючы дапамогай маральнай і заканчваючы фінансавай, юрыдычнай падтрымкай розных сацыяльных праграмаў).

Рэкамэндацыі НДА і грамадзкім актывістам

Інфармацыйны накірунак:

*інфармаваньне выбаршчыкаў
*"гарачыя" лініі
*маніторынг СМІ
*грамадзка-інфармацыйны дайджэст

Адукацыйны накірунак:

*трэнінгі
*распрацоўка дапаможнікаў для кандыдатаў і выбаршчыкаў

Праца з камісіямі:

*вылучэньне сябраў камісіяў
*кампанія "будзь сумленным" (праца зь сябрамі камісіяў, уплыў на іх і іх асяродзьдзе з мэтай садзейнічаньня іх дзейнасьці ў рамках закону)
*кампанія па інфармаваньні насельніцтва пра парушэньні камісіямі выбарчага заканадаўства
*звароты ў ЦВК

Назіраньне і маніторынг выбараў:

*адукацыя назіральнікаў і камандаў
*падсумаваньне дасьведу мінулых кампаніяў
*база зьвестак па назіраньні
*маніторынг усіх этапаў выбараў
*удзел у назіраньні і мабілізацыя новых валянтэраў
*юрыдычная дапамога для ўдзельнікаў выбараў

Сацыяльныя кампаніі:

*"Пяць крокаў да лепшага жыцьця" - кантракты, камунальныя плацяжы, заробкі ды інш.
*"Зробім лепш!" (накіраванае на вырашэньне мясцовых праблемаў. Упершыню такая кампанія праводзілася Асамблеяй НДА Беларусі ў 2002 г.)
*актывізацыя мэтавых групаў (жанчын, моладзі, інвалідаў і г. д.)

Кампанія "Прыйдзі і прагаласуй":

*актыўнасьць у акругах з дэмакратычнымі кандыдатамі
*моладзевы накірунак

Вынікі працы

У другі дзень Кангрэсу адбыліся пасяджэньні галіновых круглых сталоў. У самым пачатку канстатавалася, што супрацоўніцтва паміж арганізацыямі прадстаўленых у Асамблеі накірункаў дзейнасьці з часу мінулага Кангрэсу не было (за выключэньнем праваабарончых арганізацыяў). Таму на аснове выпрацаваных падчас дасьледаваньня эфэктыўнасьці партнэрства рэкамэндацыяў удзельнікі паспрабавалі знайсьці сваё месца ў стратэгічным пляне Асамблеі і агульныя тэмы для супрацоўніцтва.

Круглыя сталы

Падчас Кангрэсу Асамблеі НДА было праведзена 8 тэматычных круглых сталоў. Найбольшую колькасьць удзельнікаў сабраў **моладзевы** круглы стол (на здымку). Былі выпрацаваныя накірункі дзейнасьці моладзевых арганізацыяў: самаідэнтыфікацыя і фармаваньне эўрапейскага сьветапогляду моладзі, прававая абарона моладзі і дзейнасьці моладзевых грамадзкіх арганізацыяў ды інш.

Падчас пасяджэньня **праваабарончага** круглага стала адзначалася папярэдняя праца праваабаронцаў, якая вызначалася шчыльнай каардынацыяй. Даўжэй за ўсё абмяркоўвалася пытаньне аб стварэньні фонду ўзаемадапамогі. Сярод прапановаў называліся павышэньне кваліфікацыі праваабаронцаў, стварэньне “праваабарончай” рассылкі, агульнага інфармацыйнага рэсурсу і інш.

Галоўнай тэмай дыскусіі падчас працы круглага стала **сацыяльных НДА** стала агульная ідэя нацыянальнай праграмы, якая была б здольная аб’яднаць іх высілкі ў працы са сваімі мэтавымі групамі. У выніку былі сфармуляваныя тры праграмныя і два арганізацый-

ныя накірункі дзейнасьці.

Падчас правядзеньня **жаночага** круглага стала ўдзельнікі абмеркавалі прычыны адсутнасьці супольных дзеяньняў жаночых арганізацыяў у межах Асамблеі. Былі выпрацаваныя ідэі, якія маглі б аб'яднаць жаночыя арганізацыі і паспрыяць іх супольнай дзейнасьці. Сярод іншага называлася барацьба супраць кантрактнай сыстэмы і абарона маладых жанчын (маці), а таксама людзей перадпэнсійнага ўзросту, былі выпрацаваныя крокі да яе рэалізацыі.

У працы **адукацыйнага** круглага стала ўзялі ўдзел пераважна прадстаўнікі ТБМ. Пасьля абмеркаваньня актуальных адукацыйных праблемаў тры групы займаліся выпрацоўкай агульнанацыянальнай ідэі. У выніку адна з групаў назвала беларускамоўную адукацыю, другая вызначыла толькі асноўныя камунікацыйныя каналы паміж НДА, а таксама паміж НДА і зьнешнім асяродзьдзем, а трэцяя выпрацавала рэкамэндацыі да тэхнічнай працы Рабочай групы па партнэрстве ў адукацыйнай справе.

Круглы стол **рэсурсавых цэнтраў** выявіў цэлы шэраг праблемаў у функцыянаваньні рэсурсавых цэнтраў краіны: недастатковасьць інфармацыі, непадрыхтаванасьць многіх рэсурсавых цэнтраў да працы ў новых умовах, адсутнасьць абмену досьведам у межах Асамблеі. Дзеля іх вырашэньня быў выпрацаваны шэраг прапановаў, сярод якіх найбольш увагі надаецца стварэньню "базы рэсурсаў" і правядзеньню круглых сталоў, а таксама наладжваньню абмену досьведам.

Культурніцкі і краязнаўчы круглы стол прадэманстраваў імкненьне ўдзельнікаў якасна зьмяніць сытуацыю з каардынацыяй і рэалізацыяй супольных праектаў, чаго раней не было. Былі прапанаваныя шматлікія ідэі магчымых супольных дзеяньняў, такіх як наладжваньне выдавецка-інфармацыйных праектаў, кампаніяў і акцыяў, прымеркаваных да канкрэтных датаў альбо сытуацыяў (напрыклад, абароны помнікаў гісторыі і культуры).

Найменш удзельнікаў сабраў **экалягічны** круглы стол. Яго рэкамэндацыі складаюцца са збору і абмену інфармацыяй па экалягічнай сытуацыі ў краіне і мерапрыемствах, распрацоўкі пляну працы ў гэтым накірунку, правядзеньня агульнанацыянальных акцыяў і выданьня тэматычнага нумару нашага часопіса.

Падрыхтаваў А. П.

{ ВІТАНЬНЕ V КАНГРЭСУ АСАМБЛЕІ НДА }

Краінам Эўразьвязу

Мы, прадстаўнікі сотняў няўрадавых арганізацыяў Беларусі, віншуем вас з нагоды гістарычнай падзеі, якой стала ўступленьне ў Эўрапейскі Зьвяз адразу 10-ці новых краінаў, у ліку якіх і нашы бліжэйшыя суседзі.

Мы ўпэўненыя, што наша праца на карысьць разьвіцьця грамадзянскай супольнасьці Беларусі дасьць плён і дапаможа неўзабаве і нашай Радзіме стаць паўнавартаснай часткай адзінай Эўропы.

{ ІНФАРМАТАР }

ЛЕТНЯЯ ШКОЛА ЛІДЭРСТВА

29 ліпеня - 7 жніўня 2004 г. праект Праграмы разьвіцьця ААН "Садзейнічаньне пашырэньню грамадзкага ўплыву жанчын ў Рэспубліцы Беларусь" праводзіць у Менску летнюю школу грамадзка-палітычнага лідэрства. Для ўдзелу запрашаюцца дзяўчаты-лідэры 18-25 гадоў з усёй Беларусі.

Заявы на ўдзел падаюцца ў офіс праекта асабіста альбо праз пошту да 12 ліпеня 2004 г. За дадатковай інфармацыяй і блянкамі заяваў зьвяртайцеся: Эўрапейскі гуманітарны ўнівэрсытэт, 220013 г. Менск, вул. П. Броўкі, 3/2, каб. 215; Тэл./факс: (017) 296 67 83, e-mail: cce@ehu.by (з пазнакай "Летняя школа"). Больш падрабязная інфармацыя пра праект разьмешчаная на сайце www.gender.by.

Неабходнасьць якасных зьменаў

Кожная структура ў пэўны пэрыяд свайго існаваньня асэнсоўвае неабходнасьць якасных зьменаў у сваім разьвіцьці. На IV Кангрэсе была зроблена сур'ёзная заяўка на іх падрыхтоўку, тады ж было прынятае рашэньне пачаць працу над стратэгічным плянаваньнем разьвіцьця Асамблеі. Хачу адзначыць, што стратэгічнае плянаваньне не "ноў-хаў" Асамблеі. Культура гэтага мэтаду даўно вядомая ў Эўропе і ЗША. Правілы і нормы стратэгічнага плянаваньня шырока ўжываюцца і ў бізнэс-сэктары, і ў некамэрцыйным сэктары. Сам працэс стратэгічнага плянаваньня пэрманэнтны, але мае сваю структураванасьць. Адзін з галоўных этапаў - выпрацоўка стратэгічнага пляну на канкрэтна вызначаны прамежак часу. Стратэгічны плян - гэта дакумэнт, які мае свае разьдзелы. Яны не выпадковыя, а ўнутрана зьвязаныя паміж сабой, маюць пэўную іерархію і залежаць адзін ад аднаго.

Разьдзел "Бачаньне" дае апісаньне зьменаў у арганізацыі, у грамадзтве, да якіх мы хочам прыйсьці. Гэта наша, так бы мовіць, эндэашная мара, ідэал. Калі мы распрацоўвалі вобраз нашай арганізацыі ў будучыні, фактычна мы адказвалі на 2 пытаньні:

1. Якой мы бачым Асамблею праз 5 гадоў?

2. Як мы хочам, каб нас успрымалі людзі, меркаваньне якіх для нас важнае?

Разьдзел "Місія", які дастаткова разгорнута тлумачыць сэнс існаваньня арганізацыі, адказвае на шэраг пытаньняў. Куды рухаецца Асамблея? Хто мы? Што мы робім? Чаму і для каго мы існуем? Якія каштоўнасьці мы маем?

Далей стратэгічны плян утрымлівае тыя мэты і задачы, якія дазволяць нам, па нашым меркаваньні, дасягнуць нашай мары і выканаць місію.

Варта адзначыць, што стратэгічны плян - гэта "жывы" дакумэнт, які будзе штогод разглядацца і, магчыма, пераглядацца з улікам атрыманага досьведу працы ў кожным накірунку дзейнасьці.

Цяпер працягваецца дапрацоўка вельмі важнага накірунку дзейнасьці Асамблеі па ўдасканаленьні формаў і мэтадаў камунікацыі паміж сябрамі Асамблеі і зьнешнім асяродзьдзем. На Кангрэсе было вырашана, што трэба прыкласьці намаганьні дзеля стварэньня ўмоваў для арганізацыйнага разьвіцьця сябраў Асамблеі. Я як намесьніца старшыні Рабочай групы ўзяла на сябе адказнасьць за дапрацоўку стратэгічных задачаў і распрацоўку мерапрыемстваў на бліжэйшы год менавіта па гэтым пытаньні. Зразумела, што якасную працу могуць зрабіць спэцыялісты, якія маюць адпаведныя веды, досьвед канкрэтнай працы. Ужо сфармавалася кола людзей, якія выказалі жаданьне ўзяць у супольнай працы па ўдасканаленьні гэтага разьдзелу стратэгічнага пляну.

Калі будзе распрацаваны агульны Рабочы плян Асамблеі, узгоднены з усімі сябрамі і зацьверджаны Рабочай групай, можна будзе распрацаваць дакладныя функцыянальныя абавязкі кожнага намесьніка і сябра Рабочай групы.

Ірына Жыхар

Распрацоўка стратэгічнага пляну: гісторыя пытаньня

5-6 кастрычніка 2002 году падчас правядзеньня IV Кангрэсу Асамблеі НДА адбыўся круглы стол "Місія Асамблеі". На ім былі абмеркаваныя наступныя пытаньні: *што такое Асамблея, структура Асамблеі; для чаго існуе Асамблея, яе функцыі на сёньняшні дзень; формы існаваньня Асамблеі сёньня; роля сябраў Асамблеі ў яе дзейнасьці, арганізацыя працы.* У выніку была створана ініцыятыўная група з шасьці чалавек, якая была ўпаўнаважаная распрацаваць місію Асамблеі, формы і мэханізмы супрацы ў яе межах, каб вынесьці гэта на больш шырокае абмеркаваньне арганізацыяў-сябраў.

Ужо на другім пасяджэньні стала відавочна, што для распрацоўкі запланаванага неабходная далучанасьць да працэсу больш шырокага кола людзей. Было прынятае рашэньне аб правядзеньні сэсіі стратэгічнага плянаваньня, куды будуць запрошаныя прадстаўнікі ўсіх зацікаўленых арганізацыяў - сябраў Асамблеі, якія ўжо маюць досьвед распрацоўкі місіі і стратэгічнага пляну. **21-23 красавіка 2003 г.** адбылася 1-я сэсія стратэгічнага плянаваньня разьвіцьця Асамблеі НДА, арганізаваная Выканаўчым бюро. Па ацэнках удзельнікаў мерапрыемства - 22-х прадстаўнікоў буйнейшых арганізацыяў - сябраў Асамблеі - плянаваньне стала эпахальнай падзеяй ня толькі ў яе жыцьці, але і ўсяго трэцяга сэктару.

21 красавіка праходзіла дыскусія па тэме "Роля Асамблеі ў разьвіцьці трэцяга сэктару Беларусі". Падчас яе ўдзельнікі абменьваліся меркаваньнямі, чым была, чым ёсьць і чым можа быць Асамблея НДА Беларусі ў будучыні, спрабавалі прааналізаваць зробленае арганізацыяй за 5 гадоў. Вынікі першага дня засьведчылі: Асамблея, у склад якой уваходзяць каля 600 НДА краіны, павінна існаваць, але для таго, каб яна пачала эфэктыўна працаваць, неабходнае яе рэфармаваньне.

Асноўная праца па плянаваньні разгарнулася 22 і 23 красавіка. У выніку было выпрацавана бачаньне Асамблеі. Удзельнікі сфармулявалі стратэгічныя мэты і задачы арганізацыі, вызначылі найбольш пэрспэктыўныя і адэкватныя накірункі яе дзейнасьці. Быў створаны рабочы варыянт місіі. На думку ўдзельнікаў стратэгічнага плянаваньня, падчас працы стала відавочна: Асамблея – жыцьцяздольная, унікальная для трэцяга сэктару структура са сваімі вартасьцямі і хібамі. Пачатак працы па яе стратэгічным плянаваньні - гэта крок да таго, каб аднавіць і ўзмацніць яе ролю, а значыць, і ролю грамадзкага сэктару ў Беларусі. Таму галоўнае на сёньняшні дзень - не спыняць працу па арганізацыйным разьвіцьці. **7 чэрвеня** адбыўся сэмінар-арыентацыя ў стратэгічным пляне для сябраў Рабочай групы. Падчас 2-й сэсіі **напрыканцы жніўня** былі дапрацаваныя некаторыя разьдзелы стратэгічнага пляну. На працягу **сакавіка-красавіка 2004 г.** была зладжана прэзэнтацыя стратэгічнага пляну для сябраў Асамблеі ў кожнай вобласьці і ў горадзе Менску.

Стратэгічны плян разьвіцьця Асамблеі

БАЧАНЬНЕ РАЗЬВІЦЬЦЯ АСАМБЛЕІ НДА

Вынікам сваёй дзейнасьці мы бачым разьвіты трэці сэктар Беларусі, дзе Асамблея выступае мэханізмам прасоўваньня інтарэсаў НДА. Асамблея зьяўляецца аўтарытэтным аб'яднаньнем НДА і грамадзянскіх ініцыятываў, якое спрыяе разьвіцьцю дэмакратычнай прававой дзяржавы і ўплывае на зьмены ў грамадзтве. Сяброўства ў Асамблеі прэстыжнае і карыснае.

Асамблея - адкрытая да супрацоўніцтва пляцоўка з адладжаным мэханізмам абмену інфармацыяй. Асамблея мае моцныя рэгіянальныя сувязі. Кожны сябра Асамблеі можа знайсьці сабе адпаведных партнэраў і паплечнікаў.

Асамблея садзейнічае разьвіцьцю НДА, спрыяе ўкараненьню стандартаў якасьці іх працы. Вынікі такой дзейнасьці сыстэматычна аналізуюцца і ацэньваюцца.

Асамблея выконвае ролю своеасаблівага рэсурсавага цэнтру: мае бібліятэку, базы зьвестак (НДА, заканадаўства, донары, мэтадычная і інш.).

Асамблея - фармалізаванае і структураванае аб'яднаньне, мае свае нарматыўныя дакумэнты, якія прызнаюць усе сябры Асамблеі. Правілы ўзаемадзеяньня паміж сябрамі Асамблеі рэглямэнтаваныя, дзейнічаюць дакладна вызначаныя працэдуры прыняцьця рашэньняў і дакумэнтаў ад імя аб'яднаньня.

МІСІЯ

Асамблея НДА - добраахвотнае аб'яднаньне грамадзкіх арганізацыяў і ініцыятываў, якія свабодна выбіраюць розныя формы арганізацыйнага ўзаемадзеяньня, кіруючыся прынцыпамі раўнапраўя і самастойнасьці, і вызнаюць дэмакратыю і незалежнасьць Беларусі як свае каштоўнасьці. Гэтыя прынцыпы замацаваныя ў статутных і праграмных дакумэнтах арганізацыяў - сябраў Асамблеі.

Місія:

Асамблея спрыяе разьвіцьцю арганізацыяў-сябраў і станаўленьню грамадзянскай супольнасьці ў Беларусі.

Дзейнасьць Асамблеі НДА скіраваная ў першую чаргу на зарэгістраваныя і незарэгістраваныя арганізацыі і грамадзянскія ініцыятывы, якія ўваходзяць у склад Асамблеі.

Пад грамадзянскай ініцыятывай мы разумеем часткова фармалізаванае кароткатэрміновае ўтварэньне з часовай структурай.

Таксама Асамблея працуе з НДА - ня сябрамі Асамблеі, зарэгістраванымі і незарэгістраванымі арганізацыямі і грамадзянскімі ініцыятывамі.

Дзейнасьць Асамблеі скіраваная ў тым ліку на падтрымку і разьвіцьцё ініцыятыўных групаў - кола грамадзянаў, якое ня мае структуры і працэдураў фармалізацыі, але мае намер рэалізацыі пэўных мэтаў.

Арганізацыйныя прынцыпы Асамблеі:

- добраахвотны ўдзел і самастойнасьць арганізацыяў-сябраў;
- неўмяшаньне Асамблеі ва ўнутраныя справы арганізацыяў - сябраў Асамблеі;
- роўныя правы сябраў Асамблеі;
- дэмакратычныя працэдуры прыняцьця рашэньняў;
- салідарнасьць і супрацоўніцтва сябраў Асамблеі дзеля дасягненьня агульных мэтаў.

СТРАТЭГІЧНЫЯ НАКІРУНКІ ДЗЕЙНАСЬЦІ АСАМБЛЕІ НДА, МЭТЫ І ЗАДАЧЫ

I. Прасоўваньне інтарэсаў шляхам салідарных дзеяньняў

Мэта:

Стварыць эфэктыўныя мэханізмы прасоўваньня інтарэсаў НДА.

Задачы:

- Прыцягнуць максымальную колькасьць арганізацыяў да ажыцьцяўленьня салідарных дзеяньняў і паспрыяць стварэньню і пашырэньню мэтавых каліцыяў.
- Удасканаліць сыстэму калектыўнай абароны НДА шляхам умацаваньня юрыдычных службаў на базе арганізацыяў - сябраў Асамблеі.
- Садзейнічаць сыстэматычнай працы НДА дзеля ўдасканаленьня нацыянальнага заканадаўства, якое забясьпечвае ўмовы існаваньня трэцяга сэктару (пытаньні, зьвязаныя з рэгістрацыяй, абкладаньнем падаткамі, дабрачыннай дзейнасьцю, юрыдычнымі адрасамі, сацыяльнымі замовамі), а таксама дзеля абароны інтарэсаў НДА ў судовай сыстэме.
- Удасканаліць мэханізмы прасоўваньня інтарэсаў беларускіх НДА на міжнародным узроўні.
- Наладзіць адносіны зь людзьмі, якія ўплываюць на прыняцьце рашэньняў (дэпутаты, бізнэсоўцы, журналісты, аўтарытэтныя асобы).

II. Удасканаленьне формаў і мэтадаў камунікацыі паміж сябрамі Асамблеі і зьнешнім асяродзьдзем

Мэта:

1. Палепшыць імідж НДА ў грамадзтве.

Задачы:

- Удасканаліць сыстэму інфармаваньня сябраў Асамблеі па тэмах, зьвязаных з прамоцыяй НДА ў грамадзтве (праз часопіс "Асамблея", сайт, форум, сустрэчы і інш.).
- Праводзіць штогадовы аналіз іміджу НДА ў грамадзтве.
- Спрыяць арганізацыйнай працы дзеля падрыхтоўкі тых актывістаў НДА, што спэцыялізуюцца на сувязях з грамадзтвам.
- Распрацаваць і апрабаваць мадэлі грамадзкіх і інфармацыйных кампаніяў на нацыянальным і рэгіянальным узроўні.
- Наладзіць сыстэму кансультаваньня і экспэртызы ў іміджавай дзейнасьці НДА (рэкляма, PR, выдавецкая дзейнасьць і г.д.).
- Падрыхтоўка і правядзеньне форумаў.

Мэта:

2. Стварыць умовы для арганізацыйнага разьвіцьця сябраў Асамблеі.

Задачы:

- Збор, абнаўленьне і забесьпячэньне адкрытага доступу да мэтадычных матэрыялаў па арганізацыйным разьвіцьці НДА.

Мэта:

3. Пашырыць прысутнасьць НДА ў інфармацыйнай прасторы.

Задачы:

- Весьці сталую працу з журналістамі і рэдактарамі СМІ.
- Пашырыць аўдыторыю сайту з наладжанай зваротнай сувязьзю;
- Пашырыць чытацкую аўдыторыю часопіса "Асамблея".
- Удасканаліць прэс-службу Выканаўчага бюро і наладзіць каардынацыю паміж прэс-службамі сябраў Асамблеі.

Мэта:

4. Увесьці ў практыку шырокае абмеркаваньне актуальных для грамадзтва і НДА праблемаў і шляхоў іх вырашэньня.

Задачы:

- Праводзіць сыстэмную працу дзеля збору інфармацыі пра формы ўзаемадзеяньня з мэтавай аўдыторыяй, шляхі вырашэньня праблемаў дзеля пошуку найбольш эфэктыўных формаў камунікацыі.
- Наладзіць выкарыстаньне базы зьвестак экспэртаў па розных сацыяльна-эканамічных праблемах.
- Стварыць умовы для рэалізацыі публічнага абмеркаваньня праблемаў сябрамі Асамблеі.

III. Маніторынг, аналіз і ацэнка дзейнасьці грамадзкага сэктару

Мэта:

Забясьпечыць сыстэматычнае паступленьне аналітычнай інфармацыі пра стан грамадзкага сэктару арганізацыям - сябрам Асамблеі дзеля павышэньня эфэктыўнасьці іх дзейнасьці.

Задачы:

- Праводзіць штогадовы маніторынг і аналіз праблемаў і патрэбаў НДА - сябраў Асамблеі.
- Забясьпечыць сталае функцыянаваньне сыстэмы маніторынгу, аналізу і ацэнкі дзейнасьці грамадзкага сэктару.

ЗАЎВАГА:

Стратэгічны плян распрацаваны на 5 гадоў.



Рэзалюцыя

V Кангрэсу Асамблеі няўрадавых дэмакратычных арганізацыяў Беларусі

Мы, дэлегаты Кангрэсу - прадстаўнікі няўрадавых дэмакратычных арганізацыяў Беларусі, пацьвярджаючы прынцыпы, вызначаныя пры заснаваньні Асамблеі, і зыходзячы з каштоўнасьцяў дэмакратыі, прававой дзяржавы і павагі да правоў чалавека

- адзначаем, што Ўрад Беларусі ў 2003-2004 гадах актывізаваў дзеяньні, скіраваныя на абмежаваньне асабістых свабодаў грамадзянаў Беларусі. Навязваньне беларускаму грамадзтву так званай "адзінай дзяржаўнай ідэалёгіі" несумяшчальнае з правам чалавека мець уласнае меркаваньне. Распаўсюджаньне гэтай "ідэалёгіі" спрыяе ўмацаваньню падмуркаў аўтарытарнага кіраваньня, стварае глебу для сыстэмных і татальных парушэньняў правоў чалавека, супярэчыць прынцыпам, вызначаным ва Ўсеагульнай дэклярацыі правоў чалавека і ў Канстытуцыі Беларусі.

- выказваем рашучы пратэст супраць кампаніі рэпрэсіяў, накіраванай на структуры грамадзянскай супольнасьці і грамадзкіх актывістаў. Мы лічым, што забарона праваабарончых і іншых няўрадавых арганізацыяў, у тым ліку і Асамблеі, з адначасовым стварэньнем і актывізацыяй праўрадавых каляджяржаўных арганізацыяў, ёсьць праявай імкненьня ўладаў да поўнага кантролю над грамадзянскай актыўнасьцю. Зьнішчэньне Нацыянальнага гуманітарнага ліцэю і ціск на няўрадавыя адукацыйныя ўстановы мы расцэньваем як разбурэньне падмуркаў грамадзянскай супольнасьці ў Беларусі.

- падтрымліваем прыняцьце Камісіяй па правах чалавека ААН рэзалюцыі аб становішчы ў Беларусі E/CN.4/2004/L22 ад 8 красавіка 2004 году і рашэньне па Беларусі сэсіі Парлямэнцкай Асамблеі Рады Эўропы ад 28 красавіка 2004 г. Увага міжнародных інстытуцыяў да становішча ў Беларусі ёсьць вялікай маральнай падтрымкай для нашай дзейнасьці. Мы заклікаем міжнародныя інстытуцыі працягваць дзеяньні дзеля выкананьня правоў чалавека ў Беларусі.

- заклікаем усіх грамадзкіх актывістаў і няўрадавыя арганізацыі Беларусі працягваць дзейнасьць на карысьць беларускага грамадзтва дзеля пабудовы дэмакратычнай прававой дзяржавы і разьвіцьця грамадзянскай супольнасьці, нягледзячы на адкрыта варожае стаўленьне дзяржаўнай улады да такой дзейнасьці. Мы ўпэўненыя, што палітычныя рэпрэсіі і перасьлед няўрадавых арганізацыяў ня спыняць нашай дзейнасьці. Адначасова мы сьцьвярджаем намер працягваць кампанію супраціву неспрыяльным умовам дзейнасьці і праяўляць салідарнасьць з нашымі калегамі, якія падпалі пад ціск з боку рэпрэсіўнага апарату дзяржавы.

Г.Лабадзенка

Рух у накірунку дэмакратыі і свабоды

Джон Бэнджамін, супрацоўнік Міністэрства замежных справаў Вялікабрытаніі, кіраўнік аддзелу па правах чалавека:

- У мяне склалася такое ўражаньне, што беларускі трэці сэктар, нягледзячы на існуючыя цяжкія ўмовы працы, выразна абазначыў пазыцыю руху ў накірунку разьвіцьця дэмакратыі і асноўных свабодаў у Беларусі. Я быў уражаны жаданьнем прадстаўнікоў розных арганізацыяў супольна працаваць. Так што мае чаканьні былі больш чым рэалізаваныя. Для мяне было вялікім гонарам зьвярнуцца да Асамблеі з прамовай. Я жадаю сябрам Асамблеі посьпехаў у іх далейшай працы, накіраванай на разьвіцьцё адкрытай, арыентаванай на Эўропу Беларусі.

Віцебск

ПАЧАЛІСЯ СЬВЯТКАВАНЬНІ Ў ГОНАР ЮБІЛЕЮ ВАСІЛЯ БЫКАВА

У Віцебску праходзяць мерапрыемствы, прымеркаваныя да 80-х угодкаў з дня нараджэньня (19 чэрвеня) народнага пісьменьніка Беларусі Васіля Быкава (1924 - 2004).

Мерапрыемствы распачаліся зь вечарыны ў гонар юбіляра ў цэнтральнай гарадзкой бібліятэцы. Імпрэза, якая была арганізаваная абласным аддзяленьнем Саюзу беларускіх пісьменьнікаў, сабрала звыш ста аматараў і знаўцаў творчай спадчыны Быкава. Акторы Коласаўскага тэатру паказалі ўрыўкі са спэктакля, пастаўленага ў тэатры паводле твораў Быкава. На імпрэзе гучалі выступы віцебскіх літаратараў і вершы таленавітых школьнікаў, дэманстраваліся дакумэнтальныя тэлекадры пра Васіля Быкава.

Менск

ПАЧАЎСЯ СУД ПА "СПРАВЕ БХК"

1 чэрвеня ў Менскім гарадзкім гаспадарчым судзе пад старшынствам судзьдзі Міхнюк распачаўся разгляд скаргі Беларускага Хельсынскага Камітэту на рашэньне інспэкцыі Міністэрства па падатках і зборах. Праваабаронцы спрабуюць праз суд адмяніць накладзеныя фінансавыя санкцыі за нявыплату падаткаў па праектах, рэалізаваных пры падтрымцы праграмы TACIS.

Паколькі праграма TACIS зьяўляецца праграмай аказаньня тэхнічнай дапамогі краінам СНД з боку Эўразьвязу, напачатку пасяджэньня прадстаўнікі БХК хадайнічалі аб прыцягненьні да справы ў якасьці трэціх асобаў Офіса праграмы TACIS і Каардынацыйнага бюро праграмы TACIS. Гаспадарчы суд хадайніцтва не задаволіў.

У першы дзень судовага пасяджэньня бакі выявілі прынцыпова адрозны погляд на прававое рэгуляваньне праграмы TACIS і яе падатковага рэжыму. Прадстаўнік падатковай інспэкцыі тлумачыў, што зафіксаваная ў дамове паміж Эўракамісіяй і Ўрадам Беларусі норма пра тое, што "са сродкаў TACIS ня будзе фінансавацца дзяржаўны бюджэт і яны будуць вызваленыя ад падаткаў" сьведчыла толькі пра намер дзяржавы даць падатковыя ільготы гэтым праектам і праграмам. У сувязі з тым, што пэўны час мэханізм прадастаўленьня падобных ільготаў адсутнічаў, са сродкаў трэба было ў поўным аб'ёме выплачваць падаткі як са звычайнага камэрцыйнага крэдыту.

Прадстаўнікі БХК у сваю чаргу настойвалі на тым, што нормы аб беспадаткавым статусе праграмаў, зафіксаваныя ў міжнародных дамовах, не падлягаюць сумневу. Такое меркаваньне грунтуецца на здаровым сэнсе і на прынцыпе вяршэнства міжнароднага права ў параўнаньні з унутраным заканадаўствам.

Прыцягнуты па справе спэцыяліст Беларускай гандлёва-прамысловай палаты пры параўнаньні расейскага і ангельскага тэкстаў дамовы паміж Эўракамісіяй і Ўрадам Беларусі даў тлумачэньне, што дакумэнт недвухсэнсоўна прадугледжвае вызваленьне тасісаўскіх грантаў ад усіх падаткаў і збораў. Падчас прызначанага перапынку адбываўся дадатковы пераклад некаторых дакумэнтаў з ангельскай мовы.

Юры Патоцкі

А.Лянкевіч

Барань

ПАЧАЛО ПРАЦУ БЮРО САЦЫЯЛЬНАЙ ІНФАРМАЦЫІ

У Барані (Аршанскі раён) пачало працу Бюро сацыяльнай інфармацыі (БСІ). Яно заснавана пры недзяржаўнай арганізацыі "Беларуская жаночая ліга".

Бюро забясьпечвае доступ жыхароў Барані да інфармацыі пра міжнародныя акты і нацыянальнае заканадаўства ў галіне выканаьня правоў чалавека і яго стан у Беларусі. База зьвестак БСІ зьмяшчае звыш трох тысяч разнастайных дакумэнтаў. Кансультант БСІ Тамара Байкова лічыць, што "асабісты досьвед самастойнага выхаду са складанай жыцьцёвай сытуацыі, набыты чалавекам з дапамогай бюро, дасьць яму імпульс для пасьпяховых дзеяньняў ня толькі ў рашэньні прававых праблемаў, але і ў самых розных сытуацыях, якія паўстаюць на працы, у сям'і ці грамадзтве".

На Віцебшчыне бараньскае Бюро сацыяльнай інфармацыі - другая такога кшталту ўстанова пасьля Верхнядзьвінску. Агулам у краіне БСІ дзейнічаюць у 13-ці гарадах.

А.Лянкевіч

Асіповічы

ТБМ "ПАПРАВІЛА" МЯСЦОВЫЯ ЎЛАДЫ

Асіповіцкія ўлады выправілі памылку ў назве галоўнай вуліцы гораду. Гэтаму паспрыялі звароты грамадзянаў і сябраў мясцовай суполкі Таварыства беларускай мовы.

Тры гады таму на гарадзкіх вуліцах зьявіліся шыльды з назвамі вуліц, напісанымі па-беларуску. Пры гэтым галоўная вуліца гораду непісьменна называлася "вуліца Сумчанка" замест "вуліца Сумчанкі". Першымі, каму кінуўся ў вочы няправільна ўжыты склон прозьвішча земляка-партызана, былі сябры мясцовага ТБМ.

Адзін з актывістаў арганізацыі, Ігар Сімбіроў, распавядае, што "тэбээмаўцы пачалі біць у званы", каб мясцовыя ўлады выправілі памылку. Паступова да вырашэньня ўзьнятай праблемы далучыліся жыхары цэнтральнай вуліцы і нават раённая газэта. Такая актыўнасьць і абумовіла рашэньне ўладаў выправіць памылку і памяняць шыльды.

"Своеасаблівая перамога асіповіцкіх актывістаў цалкам лягічная, - лічыць сп. Сімбіроў. - У горадзе працуе адна з самых вялікіх рэгіянальных суполак ТБМ, а таксама працягвае функцыянаваць адзіная на ўсю вобласьць цалкам беларускамоўная гімназія".

Вітальд Гамбровіч

Крычаў

ЗАСЬПЕЛІ ЗА ПАРУШЭНЬНЕМ ПРЭЗЫДЭНЦКАЙ ДЫРЭКТЫВЫ

Крычаўскі райвыканкам спыніў дзейнасьць мясцовага клюбу чыгуначнікаў "Каму за трыццаць". Прычына такіх санкцыяў - парушэньне дырэктывы №1: падчас рэйду міліцыі сябры клюбу былі засьпетыя ў стане алькагольнага ап'яненьня.

Вынікам рэйду магілёўскіх міліцыянтаў, што праводзіўся ў межах агульнарэспубліканскай акцыі па выяўленьні парушальнікаў прэзыдэнцкай дырэктывы, стала затрыманьне бадай што ўсіх сябраў крычаўскага клюбу "Каму за трыццаць". Як паведамляе мясцовы "Кантакт-цэнтар", прадстаўнікі органаў правапарадку склалі стос пратаколаў, у якіх зафіксавалі грубае парушэньне дысцыпліны.

У сувязі з гэтым Крычаўскі райвыканкам вынес рашэньне аб спыненьні дзейнасьці клюбу, які пачаў працаваць толькі два месяцы таму.

Ягор Клішэвіч

Слонім

"АПЭРАТЫЎНІК" ПАКАРАНЫ ЗА ЦІСК НА ГРАМАДЗКАГА ЛІДЭРА

Інспэктар па апэратыўнай рабоце слонімскай фінансавай міліцыі Ўладзімер Юрчак прыцягнуты да матэрыяльнай адказнасьці за неправамоцныя дзеяньні па справе кіраўніка грамадзкага аб'яднаньня "Воля да разьвіцьця" Міхася Варанца.

У канцы сакавіка 2004 г. М. Варанца двойчы выклікаў лейтэнант слонімскай фінансавай міліцыі Ўладзімер Юрчак для высьвятленьня сытуацыі адносна "нявыплаты" грамадзкім аб'яднаньнем "Воля да разьвіцьця" падаткаў па праграме TACIS. Пры гэтым ён дапусьціў шэраг парушэньняў: не растлумачыў Варанцу ягоных правоў, рабіў на яго псыхалягічны ціск, пагражаў. Інфармацыя, атрыманая Юрчаком падчас папярэдняга расьсьледаваньня, стала падставай для ўзбуджэньня 23 красавіка крымінальнай справы супраць М. Варанца за "ўхіленьне ад выплаты падаткаў шляхам утойваньня".

22 красавіка Варанец падаў скаргу на дзеяньні Юрчака ва Ўпраўленьне Дэпартамэнту фінансавых расьсьледаваньняў Камітэту дзяржкантролю па Гарадзенскай вобласьці. 20 траўня старшыня апошняга паведаміў, што Юрчак "за дапушчаныя хібы пры вырашэньні матэрыялу прыцягнуты да матэрыяльнай адказнасьці".

"Хочацца верыць, што рашэньне абласнога Ўпраўленьня Дэпартамэнту фінансавых расьсьледаваньняў у дачыненьні да Юрчака ня вымушанае рэагаваньне на маю скаргу, а прынцыповая пазыцыя", - так пракамэнтаваў пакараньне апэратыўніка Міхась Варанец.

Алёна Андрэева

А.Лянкевіч

І такое бывае: ён назірае, а народ парушае...

...моцны падмурак для партнэрства

пачатак на ст. 2

рабочыя групы, склалі супольны плян, абралі адказнага за напісаньне праекту, але на гэтым усё і скончылася. Такім чынам, экалягічныя і краязнаўчыя нацыянальныя праграмы не рэалізаваліся.

Таму дзеля павышэньня эфэктыўнасьці працы галіновых круглых сталоў і разгляду стратэгіяў удасканаленьня іх працы на нацыянальным узроўні ў пэрыяд падрыхтоўкі да V Кангрэсу Асамблеі НДА было вырашана высьветліць, ці існуюць у НДА патрэбы ў разьвіцьці партнэрскіх сувязяў, а таксама прааналізаваць прадуктыўнасьць ужо дзеючых формаў партнэрства ў трэцім сэктары.

У межах дасьледаваньня былі праанкетаваныя 104 актывісты са складу НДА - сябраў Асамблеі з усіх рэгіёнаў Беларусі, праведзеныя дзьве фокус-групы, зладжана апытаньне 15-ці лідэраў НДА, якія маюць досьвед у стварэньні і функцыянаваньні партнэрскіх утварэньняў. Акрамя таго, былі вывучаныя пратаколы пасяджэньняў Рабочай групы і Кангрэсаў за ўвесь час існаваньня Асамблеі, праведзены маніторынг публікацыяў пра дзейнасьць Асамблеі і пра значныя падзеі нацыянальнага характару з жыцьця НДА за апошнія 22 месяцы.

Абагульняючы досьвед працы партнэрскіх праграмаў як сябраў Асамблеі, так і тых структураў, якія ў яе не ўваходзяць, былі сфармуляваныя наступныя **рэкамэндацыі**, што ствараюць моцны падмурак для эфэктыўнага доўгатэрміновага партнэрства:

- Наяўнасьць агульнай мэты, якую маюць усе ўдзельнікі партнэрства і якая вызначаецца агульнай праблемай (патрэбай), а таксама агульнай карысьцю.
- Артыкуляваны ўласны інтарэс (карысьць) кожнага ўдзельніка партнэрства.
- Сумеснае плянаваньне працы з улікам аб'яднаньня рэсурсаў кожнага ўдзельніка.
- Дакладная, пісьмова прапісаная рэглямэнтацыя ўзаемаадносінаў з улікам завяршальнага цыклю жыцьця партнэрскай праграмы.
- Рэгулярная камунікацыя, даступная для кожнага ўдзельніка партнэрства.
- Абавязковая поўная пісьмовая справаздачнасьць.
- Пры адсутнасьці досьведу сумеснай працы лепей пачынаць зь невялікага супрацоўніцтва.

Выпрацаваныя рэкамэндацыі і першыя вынікі дасьледаваньня былі прэзэнтаваныя на пасяджэньнях галіновых круглых сталоў і пакладзеныя ў аснову плянаваньня далейшай сумеснай дзейнасьці.

Поўныя вынікі дасьледаваньня будуць надрукаваныя ў наступным нумары нашага часопіса.

Гомель

НОВЫЯ ГРАМАДЗКІЯ ІНСПЭКТАРЫ

Сябры гомельскага грамадзкага аб'яднаньня "Асацыяцыя дзяцей і моладзі" (АСДЭМА) сталі грамадзкімі інспэктарамі па ахове прыродных рэсурсаў і навакольнага асяродзьдзя. Адпаведныя пасьведчаньні ім выдаў камітэт прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяродзьдзя Гомельскага аблвыканкаму.

Па словах старшыні арганізацыі Ўладзімера Коўзелева, экалягічныя дружыньнікі з АСДЭМА ўжо прайшлі спэцыяльную падрыхтоўку: вывучылі артыкулы Кодэксу аб адміністрацыйных парушэньнях, па якіх можна прыцягваць да адказнасьці парушальнікаў экалягічных нормаў, і пазнаёміліся з Палажэньнем "Аб грамадзкім інспэктары па ахове прыродных рэсурсаў і навакольля". У прыватнасьці, гэты дакумэнт надае ім права правяраць дакумэнты парушальнікаў і дастаўляць зламысьнікаў у аддзяленьне міліцыі. Таксама грамадзкі інспэктар мае права скласьці пратакол на парушальнікаў прыроднага заканадаўства і перадаць яго для разьбіральніцтва ў Камітэт прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяродзьдзя.

"ВЯСНА" БУДЗЕ АПЕКАВАЦЦА БРАТАМ ГЕНЭРАЛА ЗАХАРАНКІ

Праваабарончы цэнтар "Вясна" мае намер аказваць дапамогу брату экс-міністра ўнутраных справаў генэрала Юрыя Захаранкі Яўгену.

Яўген Захаранка разам са сваім непаўналетнім сынам праз адміністрацыю і суд Савецкага раёну Гомеля згубілі асноўнае месца жыхарства. На зьмене статусу Захаранкаў настаяла старшыня адміністрацыі Тацяна Філімончык, такое рашэньне падтрымаў старшыня раённага суду Аляксандар Кострыкаў.

Брата Захаранкі і яго сына пазбавілі адзінага жытла - 11-мэтровай "маласямейкі", якая была ім выдзеленая пры ўмове зьняцьця з чаргі на жыльлё. Але ў выніку сям'ю вымусілі падпісаць часовую дамову найму жыльля. "Мне сказалі, што ў адваротным выпадку я не атрымаю жыльлё, а часовую дамову пасьля перапішуць на сталую", - патлумачыў Я. Захаранка.

Беларускія праваабаронцы прапанавалі сп. Захаранку сваю дапамогу. Яна будзе заключацца ў юрыдычных кансультацыях, бо пацярпелы мае намер абскардзіць рашэньне суду. Гомельскія "вясноўцы" лічаць, што ў такім складаным жыльлёвым пытаньні родны зьніклага палітыка стаў ахвярай невыпадкова.

Нагадаем, сваю кар'еру зьніклы Юры Захаранка пачынаў у тым жа Савецкім раёне Гомеля.

Вольга Астроўская

Як дасягаецца высокая мэта

Нататкі пасьля Кангрэсу

Дэлегатам Кангрэсу Асамблеі дэмакратычных няўрадавых арганізацыяў у першы дзень была прапанаваная праца ў сэкцыях, у другі дзень - у круглых сталах. Да якой сэкцыі і да якога круглага стала праявіць цікавасьць, яны вызначалі самі. Гэта выявіла вытлумачальную і зразумелую розьніцу ў папулярнасьці тых ці іншых праблемаў, што былі прапанаваныя Рабочай групай для сэкцыяў і круглых сталоў.

Напрыклад, тэма маючых адбыцца ўвосень выбараў у Палату прадстаўнікоў сваёй спрэчнай для трэцяга сэктару актуальнасьцю (што выявілася ці ня ў самым пачатку працы Кангрэсу) прыцягнула да сябе найбольшую колькасьць дэлегатаў. А вось дыскусія на экалягічную тэму, відаць, у выніку толькі што перажытага ў красавіку чарговага выкіду чарнобыльскай грамадзкай эмацыйнасьці, сабрала найменшую колькасьць удзельнікаў. Гэта, аднак, не паўплывала ані на вастрыню гаворкі, ані на зьмястоўнасьць прапановаў.

Усе дыскусіі праходзілі дэмакратычна. Занатаваньне асноўных прапановаў забясьпечвалі падзеленыя па сэкцыях і круглых сталах сябры Рабочай групы і найбольш аўтарытэтныя ў няўрадавым сэктары асобы. Менавіта гэта абумовіла выяўленьне цікавых прапановаў і новых ідэяў, што датычацца далейшага разьвіцьця Асамблеі і ўсяго грамадзкага сэктару - праз прызнаньне і забесьпячэньне такіх каштоўнасьцяў, як раўнапраўе і самастойнасьць, дэмакратыя і незалежнасьць краіны.

Сэкцыя па абмеркаваньні стратэгічнага пляну, на мой погляд, прайшла пасьпяхова. Галоўнай адметнасьцю дыскусіі, на думку яе ўдзельнікаў, а пазьней - усіх дэлегатаў Кангрэсу, стала наступнае: усе прадстаўнікі сотняў НДА пагадзіліся з тым, што плян распрацоўваецца і фармулюецца ў правільным накірунку. Ён ужо сёньня можа быць пакладзены (так яно і адбываецца) у падмурак працы.

Высокім узроўнем кваліфікаванасьці ўдзельнікаў вызначаліся і іншыя сэкцыі, а таксама круглыя сталы. Узровень дасягнутага і больш высокія задачы на пэрспэктыву выявілі падчас дыскусіяў гатоўнасьць актывістаў НДА замацоўваць дасягнутае і рухацца далей.

...Надта ж прыцягальная наперадзе мэта: дэмакратыя, прыстойнасьць, незалежнасьць. Не было на Кангрэсе дэлегата, які б гэтага не разумеў і пра тое ня думаў. Хаця гаварылася нібыта зусім пра іншае - пра штодзённае і рабочае (без чаго, зь іншага боку, ні да якой мэты не дайсьці).

Генадзь Суднік, г. Магілёў

АД РЭДАКЦЫІ

Прапануем нашым чытачам больш актыўна ўдзельнічаць у абмеркаваньні грамадзкага жыцьця Беларусі ў рубрыцы "Ліставаньне". Пішыце пра дзейнасьць вашых арганізацыяў, аб праведзеных мерапрыемствах, пра вартыя ўвагі падзеі грамадзкага жыцьця. Найбольш цікавыя допісы будуць зьмяшчацца ў часопісе "Асамблея".

Нашыя каардынаты: ngo@belngo.info

Галаванаў усё зафіксаваў

У канцы красавіка ў афіцыйных беларускіх СМІ зьявілася інфармацыя пра сустрэчу "прадстаўнікоў трэцяга сэктару" з кіраўніцтвам Міністэрства юстыцыі. На яе былі запрошаныя кіраўнікі 45-ці грамадзкіх арганізацыяў. У абмеркаваньні "пытаньняў, зьвязаных зь дзейнасьцю ГА", узялі ўдзел міністар юстыцыі Галаванаў, начальнік Упраўленьня грамадзкіх аб'яднаньняў Сухінін і ягоны намесьнік Сьліжэўскі. Грамадзкія дзеячы, прозьвішчы якіх афіцыйныя СМІ не называюць, унесьлі 15 прапановаў, а міністар паабяцаў садзейнічаць у іх вырашэньні. "Лідэры аб'яднаньняў інвалідаў, спажыўцоў, кампазытараў, дабрачынцаў, артыстаў і многіх іншых зьвярнуліся да міністра з масай прыватных праблемаў - ад унясеньня падатковых плацяжоў да афармленьня пасьведчаньняў асобы. Усе канструктыўныя заўвагі Віктар Галаванаў зафіксаваў і паабяцаў зрабіць адпаведныя захады", - паведамляе БЕЛТА.

Глуская загадка

Тое, што нярэдка пошта грамадзкіх актывістаў Беларусі незаконна чытаецца нейкімі асобамі альбо органамі, не зьяўляецца сакрэтам. Часам лісты зьнікаюць бясьсьледна, часта прыходзяць у "пашкоджаным выглядзе". А вось так выглядала запрашэньне на ўдзел у Кангрэсе Асамблеі НДА, якое атрымаў грамадзкі актывіст з Глуску Ігар Кірын. Паперы, дасланыя ў запячатанай капэрце па пошце, былі кімсьці парваныя і падкінутыя сп. Кірыну. Гэта, праўда, не перашкодзіла грамадзкаму актывісту своечасова прыехаць на Кангрэс.



Марыніча трымаюць за кратамі

З 26 красавіка ў сьледчым ізалятары КДБ знаходзіцца беларускі дыплямат, былы міністар зьнешнеэканамічных сувязяў, экс-дэпутат Парлямэнту, прэзыдэнт Міжнароднай грамадзкай арганізацыі "Беларуская асацыяцыя "Дзелавая ініцыятыва" Міхаіл Марыніч. Беларуская грамадзкасьць дамагаецца яго вызваленьня, а група грамадзкіх дзеячоў накіравала ў праваахоўныя органы хадайніцтвы аб вызваленьні Марыніча пад іх асабістае паручыцельства.

Г.Лабадзенка

Будуць новыя памятныя знакі

13 траўня на пасяджэньні грамадзкай ініцыятывы "За ўратаваньне Курапатаў" было прынятае рашэньне пра ўсталяваньне ў Курапатах памятных знакаў рэпрэсаваным мусульманам і юдэям, на што далі згоду прадстаўнікі мусульманскай і юдэйскай канфэсіяў.

Падрыхтаваў Сяргей Клімовіч

Аптымістычны настрой

прынёс новы дыск “Старога Ольсы”

Нядаўна гурт сярэднявечнай музыкі “Стары Ольса” скончыў рэалізацыю праекту па стварэньні першай у Беларусі музычнай аповесьці. Музыкі і прадусар гурта Алена Макоўская (па сумяшчальніцтве старшыня міжнароднага грамадзкага аб’яднаньня “Згуртаваньне беларусаў сьвету “Бацькаўшчына”) ацэньваюць яго як пасьпяховы.

Назваць праект пасьпяховым музыкам, па іх уласным перакананьні, дазваляе шэраг прычынаў. Найперш гэта музычная крытыка, якая дае выключна станоўчыя рэцэнзіі на дыск “Ладзьдзя роспачы”, а таксама водгукі слухачоў. Ганарацца музыкі і тым, што ім удалося выдаць паўнавартасны ліцэнзаваны дыск, дзеля чаго давялося павялічыць наклад. Шэраг людзей (ад музыкаў да тэхнічных супрацоўнікаў) абсалютна бясплатна працавалі над праектам. “Дзякуючы эканоміі сродкаў на аплаце працы супрацоўнікаў мы змаглі павялічыць наклад, - кажа лідэр гурта Зьміцер Сасноўскі. - У адваротным выпадку дыск мог быць толькі самвыдатаўскім і мець адпаведныя абмежаваньні”.

Працуючы над кружэлкай, музыкі ўпершыню ў Беларусі хацелі выпусьціць дыск ліцэнзаванай якасьці, які можна было б праслухоўваць на любой аўдыётэхніцы. “Мы хацелі стварыць прэцэдэнт, выпусьціўшы аўдыёспэктакаль па прозе. У іншых краінах гэта ўжо рабілася. Мы адмыслова выбіралі беларускую клясычную гістарычную прозу”, - гаворыць Сасноўскі. Цалкам згодная з творцамі ў тым, што Ўладзімер Караткевіч - лепшы прадстаўнік беларускай гістарычнай прозы, і “Ладзьдзя роспачы” лепшае таму пацьверджаньне. Дзея твору адбываецца ў XVI стагодзьдзі і, паводле творцаў, добра стасуецца з тым, што яны робяць: рэканструююць музыку, музычныя інструмэнты, звычаі, вопратку сярэднявечнай і рэнэсанснай Беларусі. “Але галоўнае, з-за чаго мы абралі “Ладзьдзю роспачы”, - непадобнасьць гэтай аповесьці да абсалютнай большасьці твораў беларускай літаратуры. Яна не апавядае пра цяжкі лёс і адвечны прыгнёт беларушчыны. Калі чытаеш яе, ня хочацца плакаць. Гэтая аповесьць вельмі жыцьцесьцьвярджальная, - перакананы Зьміцер. - Галоўны герой Гервасій Выліваха знаходзіць сілы і мужнасьць прынцыпова не пагаджацца з правіламі, не пакутаваць ад усяго, што адбываецца навокал, ён весяліцца, радуецца жыцьцю. Пры гэтым ён захоўвае глыбокае пачуцьцё любові да сваёй зямлі. Аповесьць мае “хэпі энд”, вельмі важны для любой нацыянальнай ідэі, асабліва для беларускай, што робіць яе канкурэнтаздольнай”. А яшчэ ён лічыць, што калі сучасныя беларускія пісьменьнікі створаць нешта падобнае па настроі да “Ладзьдзі роспачы”, мы пачнем думаць па-іншаму і жыць па-іншаму.

А.Лянкевіч

Праект па стварэньні аўдыёаповесьці рэалізаваны пры падтрымцы амбасады ЗША ў Менску. 19 траўня адбылася пасьпяховая прэзэнтацыя дыска. На яе сабралося шмат моладзі, нямала прыйшло грамадзкіх актывістаў, на што, відаць, зрабіла ўплыў набліжанасьць гурта да грамадзкіх колаў. Агульны настрой прэзэнтацыі, як і настрой аповесьці, быў вельмі аптымістычным і жыцьцесьцьвярджальным, таму ўсе прысутныя пакідалі залю з пачуцьцём гонару за нашу гісторыю і краіну.

Алёна Андрэева

Некаторыя асаблівасьці розных арганізацыйна-прававых формаў некамэрцыйных арганізацыяў

У сувязі са зьяўленьнем у беларускім заканадаўстве розных арганізацыйна-прававых формаў некамэрцыйных арганізацыяў грамадзяне, якія жадаюць займацца грамадзкай дзейнасьцю, сутыкаюцца зь неабходнасьцю выбару. Зьмешчаная ў гэтым нумары "Асамблеі" табліца дапаможа разабрацца ў асаблівасьцях стварэньня і дзейнасьці некаторых арганізацыйна-прававых формаў некамэрцыйных арганізацыяў, такіх як фонд, установа і грамадзкае аб'яднаньне[1].

Вольга Смалянка - юрыст. Да моманту ліквідацыі грамадзкага аб'яднаньня "Незалежнае таварыства прававых дасьледаваньняў" зьяўлялася сябрам яго Праўленьня.

КРЫТЭРЫІ ПАРАЎНАНЬНЯ	ФОНД	УСТАНОВА	ГРАМАДЗКАЕ АБ'ЯДНАНЬНЕ
ВЫЗНАЧЭНЬНЕ	Некамэрцыйная арганізацыя, якая ня мае сяброўства, заснаваная грамадзянамі і (альбо) юрыдычнымі асобамі на падставе добраахвотных маёмасных унёскаў. Мае сацыяльныя, дабрачынныя, культурныя, адукацыйныя і іншыя карысныя для грамадзтва мэты.	Арганізацыя, створаная ўласьнікам для зьдзяйсьненьня кіруючых, сацыяльна-культурных альбо іншых функцыяў некамэрцыйнага характару і якая цалкам альбо часткова фінансуецца ім.	Добраахвотная фармацыя грамадзянаў, якую яны стварылі на падставе агульнасьці інтарэсаў для сумеснай рэалізацыі грамадзянскіх, эканамічных і культурных правоў.
РЭГІСТРУЮЧЫ ОРГАН	Рэгістрацыя зьдзяйсьняецца аблвыканкамамі (Менскім гарвыканкамам), якія маюць права дэлегаваць частку паўнамоцтваў па дзяржаўнай рэгістрацыі і ліквідацыі (спыненьні дзейнасьці) мясцовым выканаўчым і распарадчым органам.	Рэгістрацыя зьдзяйсьняецца аблвыканкамамі (Менскім гарвыканкамам), якія маюць права дэлегаваць частку паўнамоцтваў па дзяржаўнай рэгістрацыі і ліквідацыі (спыненьні дзейнасьці) мясцовым выканаўчым і распарадчым органам.	Упраўленьні юстыцыі аблвыканкамаў (Менгарвыканкаму) (для мясцовых); Міністэрства юстыцыі (для рэспубліканскіх і міжнародных). Акрамя гэтага дакумэнты накіроўваюцца для атрыманьня заключэньня Рэспубліканскай камісіі па рэгістрацыі (перарэгістрацыі) грамадзкіх аб'яднаньняў.
ЗАСНАВАЛЬНІКІ	Грамадзяне і (альбо) юрыдычныя асобы	Грамадзянін альбо юрыдычная асоба	Для рэгістрацыі міжнароднага грамадзкага аб'яднаньня неабходная наяўнасьць арганізацыйных структураў у Рэспубліцы Беларусь (ня менш за 10 сябраў) і ў адной альбо некалькіх замежных дзяржавах (ня менш як 3 сябры). Для рэспубліканскага - ня менш як па 10 заснавальнікаў ад большасьці вобласьцяў Рэспублікі Беларусь, а таксама ад г. Менску. Для мясцовага - ня менш як 10 заснавальнікаў, якія стала жывуць у большасьці адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак тэрыторыі, на якую будзе распаўсюджвацца яго дзейнасьць.

КРЫТЭРЫІ ПАРАЎНАНЬНЯ	ФОНД	УСТАНОВА	ГРАМАДЗКАЕ АБ'ЯДНАНЬНЕ
ПРАВЫ ЗАМЕЖНЫХ ГРАМАДЗЯНАЎ НА СТВАРЭНЬНЕ АРГАНІЗАЦЫІ І ЎСТУПЛЕНЬНЕ Ў ЯЕ	Не абмежавана	Не абмежавана	У адпаведнасьці з заканадаўствам замежныя грамадзяне і асобы без грамадзянства могуць уступаць у дзеючыя грамадзкія аб'яднаньні, калі гэта прадугледжана іх статутамі. На практыцы рэгіструючыя органы ставяць магчымасьць уступленьня замежных грамадзянаў у аб'яднаньні ў залежнасьць ад іх сталага пражываньня на тэрыторыі, на якую аб'яднаньне будзе распаўсюджваць сваю дзейнасьць.
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ ЗБОР (+ ДАДАТКОВЫЯ ФІНАНСАВЫЯ ЗАТРАТЫ НА СТАДЫІ РЭГІСТРАЦЫІ)	6 эўра (вызначаецца ў беларускіх рублях зыходзячы з устаноўленага Нацыянальным банкам афіцыйнага курсу беларускага рубля да эўра на першы дзень месяца, у якім заснаваўчыя дакумэнты прадастаўляюцца (падаюцца) у рэгіструючы орган. Дадатковыя затраты: 1) натарыяльнае засьведчаньне арыгіналу і копіі статуту; 2) узгадненьне найменьня[2] (1 базавая велічыня). Засьведчаньне ўстаноўчых дакумэнтаў заснавальніка - юрыдычнай асобы. Для заснавальнікаў - замежных фізычных асобаў неабходна прадаставіць ксэракопію пашпарта зь перакладам на беларускую (расейскую) мову (подпіс перакладчыка натарыяльна засьведчваецца).	6 эўра (вызначаецца ў беларускіх рублях зыходзячы з устаноўленага Нацыянальным банкам афіцыйнага курсу беларускага рубля да эўра на першы дзень месяца, у якім заснаваўчыя дакумэнты прадстаўляюцца (падаюцца) у рэгіструючы орган. Дадатковыя затраты: 1) натарыяльнае засьведчаньне арыгіналу і копіі статуту; 2) узгадненьне найменьня (1 базавая велічыня). Засьведчаньне ўстаноўчых дакумэнтаў заснавальніка - юрыдычнай асобы. Для заснавальнікаў - замежных фізычных асобаў неабходна прадаставіць ксэракопію пашпарта зь перакладам на беларускую (расейскую) мову (подпіс перакладчыка натарыяльна засьведчваецца).	Для мясцовых арганізацыяў - 10 базавых велічынь (базавая велічыня - 19.000). Для рэспубліканскіх і міжнародных - 25 базавых велічынь (за рэгістрацыю міжнародных 50% зьбіраецца ў замежнай валюце). З рэспубліканскіх і мясцовых моладзевых і дзіцячых аб'яднаньняў рэгістрацыйны збор не спаганяецца. Дадатковыя затраты: Аплата за паведамленьне пра рэгістрацыю ў вызначаных сродках масавай інфармацыі. Для міжнародных - засьведчаньне подпісаў замежных заснавальнікаў, а таксама пераклад дакумэнтаў (у выпадку неабходнасьці).
ТЭРМІН РЭГІСТРАЦЫІ	Месячны тэрмін з дня падачы ўсіх неабходных для дзяржаўнай рэгістрацыі дакумэнтаў. Рэгіструючы орган мае права працягнуць тэрмін дзяржаўнай рэгістрацыі да двух месяцаў з паведамленьнем пра гэта заснавальніка.	Месячны тэрмін з дня падачы ўсіх неабходных для дзяржаўнай рэгістрацыі дакумэнтаў. Рэгіструючы орган мае права працягнуць тэрмін дзяржаўнай рэгістрацыі да двух месяцаў з паведамленьнем пра гэта заснавальніка.	У адпаведнасьці з заканадаўствам - месячны тэрмін з дня падачы ўсіх неабходных для дзяржаўнай рэгістрацыі дакумэнтаў. Рэгіструючы орган мае права прыняць рашэньне пра адтэрміноўку на яшчэ адзін месяц. На практыцы - працэс рэгістрацыі можа зацягнуцца на паўгода і нават больш.

КРЫТЭРЫІ ПАРАЎНАНЬНЯ	ФОНД	УСТАНОВА	ГРАМАДЗКАЕ АБ'ЯДНАНЬНЕ
ПРЫЧЫНЫ АДМОВЫ Ў РЭГІСТРАЦЫІ (У АДПАВЕДНАСЬЦІ З ЗАКАНАДАЎСТВАМ)	1. Фонд разьмешчаны ў жылым памяшканьні без адпаведнага рашэньня мясцовага выканаўчага і распарадчага органа альбо па месцы знаходжаньня (у адным памяшканьні) іншай камэрцыйнай ці некамэрцыйнай арганізацыі. 2. Заснавальнік мае непагашаную альбо ня зьнятую судзімасьць за злачынствы супраць уласнасьці і парадку зьдзяйсьненьня эканамічнай дзейнасьці. 3. У адносінах да аднаго з заснавальнікаў ня выканана судовае рашэньне аб спагнаньні на маёмасьць. 4. Пры дзяржаўнай рэгістрацыі фонду будзе ўстаноўлена забарона на займаньне прадпрымальніцкімі відамі дзейнасьці для яго заснавальніка (-аў). 5. Пры рэарганізацыі рэгіструючаму органу не прадастаўлены разам з заснаваўчымі дакумэнтамі перадатачны акт альбо разьдзяляльны балянс, ці ў заснаваўчых дакумэнтах фонду, што ствараецца, адсутнічаюць палажэньні аб праваперaемнасьці па абавязках рэарганізаванай юрыдычнай асобы.	1. Установа разьмешчана ў жылым памяшканьні без адпаведнага рашэньня мясцовага выканаўчага і распарадчага органа альбо па месцы знаходжаньня (у адным памяшканьні) іншай камэрцыйнай ці некамэрцыйнай арганізацыі. 2. Заснавальнік мае непагашаную альбо ня зьнятую судзімасьць за злачынствы супраць уласнасьці і парадку зьдзяйсьненьня эканамічнай дзейнасьці. 3. У адносінах да аднаго з заснавальнікаў ня выканана судовае рашэньне аб спагнаньні на маёмасьць. 4. Пры дзяржаўнай рэгістрацыі ўстановы будзе ўстаноўлена забарона на займаньне прадпрымальніцкімі відамі дзейнасьці для яго заснавальніка. 5. Пры рэарганізацыі рэгіструючаму органу не прадастаўлены разам з заснаваўчымі дакумэнтамі перадатачны акт альбо разьдзяляльны балянс, ці ў заснаваўчых дакумэнтах установы, што ствараецца, адсутнічаюць палажэньні аб праваперaемнасьці па абавязках рэарганізаванай юрыдычнай асобы.	1. Парушэньне ўстаноўленага парадку стварэньня аб'яднаньня. 2. Неадпаведнасьць статуту аб'яднаньня (мэтаў, задачаў, мэтадаў працы, тэрыторыі дзейнасьці аб'яднаньня) патрабаваньням заканадаўства. 3. Непрадастаўленьне аб'яднаньнем усіх прадугледжаных заканадаўствам дакумэнтаў, неабходных для дзяржаўнай рэгістрацыі. 4. Неадпаведнасьць назвы аб'яднаньня, у тым ліку скарочанай, яго сымболікі, а таксама ўмоваў сяброўства ў аб'яднаньні патрабаваньням заканадаўства і статуту аб'яднаньня. 5. Невыкананьне ў месячны тэрмін патрабаваньняў, пазначаных у рашэньні аб адтэрміноўцы дзяржаўнай рэгістрацыі аб'яднаньня.
АБАВЯЗАК ЗАСНАВАЛЬНІКА ПА ФАРМАВАНЬНІ МАЁМАСЬЦІ	Ствараецца на падставе добраахвотных маёмасных унёскаў (мінімальны і максымальны памер ня вызначаны, не патрабуецца на стадыі рэгістрацыі).	Фінансуецца ўласьнікам цалкам альбо часткова.	Няма
СЯБРОЎСТВА	Ня мае	Ня мае	Для дзейнасьці аб'яднаньня неабходная наяўнасьць: - для міжнародных аб'яднаньняў - ня менш 10 сябраў ад Рэспублікі Беларусь, а таксама ня менш аднаго сябра ад адной альбо некалькіх замежных дзяржаваў; - для рэспубліканскіх аб'яднаньняў - ня менш як па 10 сябраў ад большасьці вобласьцяў Рэспублікі Беларусь, а таксама ад гораду Менску; - для мясцовых аб'яднаньняў - ня менш 10 сябраў у большасьці адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак тэрыторыі, на якую будзе распаўсюджвацца дзейнасьць аб'яднаньня.

КРЫТЭРЫІ ПАРАЎНАНЬНЯ	ФОНД	УСТАНОВА	ГРАМАДЗКАЕ АБ'ЯДНАНЬНЕ
ПРАДПРЫМАЛЬНІЦКАЯ ДЗЕЙНАСЬЦЬ	Мае права займацца прадпрымальніцкай дзейнасьцю, неабходнай для дасягненьня грамадзка карысных мэтаў, дзеля якіх ён створаны, і адпаведнай гэтым мэтам. Прадпрымальніцкая дзейнасьць павінна таксама адпавядаць прадмету дзейнасьці.	Мае права займацца прадпрымальніцкай дзейнасьцю, калі гэта прадугледжана статутам. Прадпрымальніцкая дзейнасьць можа зьдзяйсьняцца толькі ў межах, у якіх яна неабходная для статутных мэтаў, дзеля якіх створана ўстанова, адпавядае гэтым мэтам і прадмету дзейнасьці.	Прадпрымальніцкая дзейнасьць можа зьдзяйсьняцца толькі ў межах, у якіх яна неабходная для статутных мэтаў, дзеля якіх створана аб'яднаньне, адпавядае гэтым мэтам і прадмету дзейнасьці. На практыцы гэтае права рэгулярна аспрэчваецца рэгіструючымі органамі.
АДКАЗНАСЬЦЬ ЗАСНАВАЛЬНІКА	Заснавальнікі не адказваюць па абавязках створанага імі фонду, а фонд не адказвае па абавязках сваіх заснавальнікаў.	Установа адказвае па сваіх абавязках грашовымі сродкамі, якія знаходзяцца ў яе распараджэньні. Пры іх недастатковасьці субсыдыярную адказнасьць нясуць заснавальнікі.	Заснавальнікі (сябры) не адказваюць па абавязках аб'яднаньняў, а аб'яднаньні не адказваюць па абавязках сваіх сябраў.
РАСПАРАДЖЭНЬНЕ МАЁМАСЬЦЮ	Маёмасьць, перададзеная фонду яго заснавальнікамі (удзельнікамі), зьяўляецца ўласнасьцю фонду.	Установа ня мае права бяз згоды ўласьніка адчужаць альбо іншым спосабам распараджацца замацаванай за ім маёмасьцю, а таксама маёмасьцю, набытай за кошт сродкаў, выдзеленых яму па каштарысу. Атрыманыя ад прадпрымальніцкай дзейнасьці прыбыткі і набытая за іх кошт маёмасьць паступаюць у самастойнае распараджэньне ўстановы і ўлічваюцца на асобным балянсе, калі іншае не прадугледжана заканадаўствам.	Удзельнікі (сябры) аб'яднаньняў не захоўваюць правоў на перададзеную імі маёмасьць гэтым арганізацыям ва ўласнасьць, у тым ліку на сяброўскія ўнёскі.
ТЭРЫТОРЫЯ ДЗЕЙНАСЬЦІ	Ня мае абмежаваньняў	Ня мае абмежаваньняў	Залежыць ад статусу аб'яднаньня. Дзейнасьць міжнароднага аб'яднаньня распаўсюджваецца на тэрыторыю Рэспублікі Беларусь (адной альбо некалькіх адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак) і тэрыторыю аднаго ці некалькіх замежных дзяржаваў і мае там арганізацыйныя структуры. Дзейнасьць рэспубліканскага - на ўсю тэрыторыю Рэспублікі Беларусь. Мясцовага - на тэрыторыю адной альбо некалькіх адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак.

КАМУНІКАТ

КРЫТЭРЫІ ПАРАЎНАНЬНЯ	ФОНД	УСТАНОВА	ГРАМАДЗКАЕ АБ'ЯДНАНЬНЕ
СПЭЦЫЯЛЬНЫЯ ПАДАТКОВЫЯ ІЛЬГОТЫ	Глядзіце калёнку "грамадзкія аб'яднаньні" п. 1.	Глядзіце калёнку "грамадзкія аб'яднаньні" п. 1.	1. У склад прыбыткаў ад пазарэалізацыйных апэрацыяў у некамэрцыйных арганізацыях дзеля мэтаў падаткаабкладаньня не ўключаюцца: а) уступныя, паявыя і сяброўскія ўнёскі ў памерах, прадугледжаных статутамі; б) маёмасьць і грашовыя сродкі, бязвыплатна атрыманыя ад юрыдычных і фізычных асобаў Рэспублікі Беларусь і выкарыстаныя па мэтавым прызначэньні. в) прыбыткі (працэнты) ад захаваньня грашовых сродкаў, указаных у падпунктах "а" і "б", на разьліковых, бягучых і іншых рахунках ва ўстановах банкаў. 2. Грамадзкія аб'яднаньні, якія не зьдзяйсьняюць прадпрымальніцкую дзейнасьць, не выплачваюць адзіны плацеж (надзвычайны падатак і адлічэньні ў дзяржаўны фонд садзейнічаньня занятасьці). 3. Дадатковыя падатковыя ільготы маюць аб'яднаньні інвалідаў і пэнсіянэраў.
ІНШЫЯ ІЛЬГОТЫ	Ня мае	Ня мае	Арэнда. Аб'яднаньням, якія не зьдзяйсьняюць прадпрымальніцкую дзейнасьць, тым, што арэндуюць памяшканьні, якія знаходзяцца ў дзяржаўнай уласнасьці, устанаўліваецца паніжаючы каэфіцыент 0,1 кда базавых ставак арэнднай платы за памяшканьні плошчай да 75 кв.м.
АБАВЯЗАК ДАВАЦЬ СПРАВАЗДАЧУ ПРА СВАЮ ДЗЕЙНАСЬЦЬ	Абавязаны штогод публікаваць справаздачу пра выкарыстаньне сваёй маёмасьці.	Ня мае	Ня мае
УНЯСЕНЬНЕ ЗЬМЕНАЎ І ДАПАЎНЕНЬНЯЎ У СТАТУТ	Статут фонду можа быць зьменены органамі фонду, калі статутам прадугледжаная магчымасьць яго зьмены ў такім парадку. Калі захаваньне статуту ў нязьменным выглядзе цягне за сабой наступствы, якія было немагчыма прадбачыць пры заснаваньні фонду, а магчымасьць зьмены статуту ў ім не прадугледжаная альбо статут не зьмяняецца ўпаўнаважанымі асобамі, права ўнясеньня зьменаў належыць суду па заяве органаў фонду альбо органа, упаўнаважанага зьдзяйсьняць нагляд за яго дзейнасьцю.	Працэдура прадугледжваецца статутам.	Працэдура прадугледжваецца статутам.

KAMUNIKAT.org

КРЫТЭРЫІ ПАРАЎНАНЬНЯ	ФОНД	УСТАНОВА	ГРАМАДЗКАЕ АБ'ЯДНАНЬНЕ
АСАБЛІВАСЬЦІ ЛІКВІДАЦЫІ	Рашэньне пра ліквідацыю можа прыняць **толькі суд** па заяве зацікаўленых асобаў. Фонд можа быць ліквідаваны: калі маёмасьці фонду недастаткова для зьдзяйсьненьня яго мэтаў і верагоднасьць атрыманьня неабходнай маёмасьці немагчымая; калі мэты фонду ня могуць быць дасягнутыя, а неабходныя зьмены ня могуць быць зробленыя; у выпадку ўхіленьня фонду ў яго дзейнасьці ад мэтаў, прадугледжаных статутам; у іншых выпадках, прадугледжаных заканадаўствам[3]. Акрамя таго, ліквідуецца па рашэньні суду ў адпаведнасьці з арт. 57 Грамадзянскага Кодэксу (гл. а. 2 калёнкі "ўстанова").	Ліквідуецца ў парадку, устаноўленым Грамадзянскім кодэксам (арт. 57) для ўсіх юрыдычных асобаў па рашэньні: 1) яго заснавальніка альбо органа, упаўнаважанага на гэта заснаваўчымі дакумэнтамі, у тым ліку ў сувязі са сканчэньнем тэрміну, на які створана ўстанова; дасягненьнем мэты, дзеля якой яна створана; прызнаньнем судом несапраўднай рэгістрацыі ўстановы ў сувязі з дапушчанымі пры яго стварэньні парушэньнямі заканадаўства, якія маюць непапраўны характар; 2) суду ў выпадках: - непрыняцьця рашэньня пра ліквідацыю ў адпаведнасьці з пунктам 1 у сувязі з заканчэньнем тэрміну, на які створана ўстанова; дасягненьнем мэты, дзеля якой яна створана; - ажыцьцяўленьня дзейнасьці без належнага дазволу (ліцэнзіі) альбо дзейнасьці, забароненай заканадаўствам, ці зь іншымі неаднаразовымі ці грубымі парушэньнямі заканадаўства; пры сыстэматычным ажыцьцяўленьні дзейнасьці, якая супярэчыць статутным мэтам заснавальніка; прызнаньня судом несапраўднай рэгістрацыі ўстановы ў сувязі з дапушчанымі пры яе стварэньні парушэньнямі заканадаўства; у іншых выпадках, прадугледжаных заканадаўствам[3].	1. Ліквідуецца па рашэньні органа, упаўнаважанага на гэта статутам. 2. Аб'яднаньні ліквідуюцца па рашэньні суду ў выпадках: 1) ажыцьцяўленьня дзеяньняў, накіраваных на зьвяржэньне альбо гвалтоўную зьмену канстытуцыйнага ладу, парушэньне цэласнасьці і бясьпекі дзяржавы, прапаганду вайны, гвалту, распальваньне нацыянальнай, рэлігійнай і расавай варожасьці, а таксама дзеяньняў, адмоўна ўплываючых на фізычнае і псыхічнае здароўе грамадзянаў; 2) паўторнага на працягу году ажыцьцяўленьня дзеяньняў, за якія было вынесена пісьмовае папярэджаньне; 3) калі пры рэгістрацыі аб'яднаньня з боку яго заснавальнікаў былі дапушчаныя парушэньні Закону "Аб грамадзкіх аб'яднаньнях", іншых актаў заканадаўства; 4) за аднаразовае парушэньне заканадаўства аб масавых мерапрыемствах, у выпадках, прама прадугледжаных заканадаўствам[4]. 5) за парушэньне патрабаваньняў, прадугледжаных часткамі першай-трэцяй п. 4 Дэкрэту Прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь ад 28.11.2003 году № 24 "Аб некаторых захадах па ўдасканаленьні парадку атрыманьня і выкарыстаньня замежнай бязвыплатнай дапамогі". На практыцы, акрамя гэтага, ліквідуецца па рашэньні суду ў адпаведнасьці з арт. 57 Грамадзянскага кодэксу (гл. п. 2 калёнкі "ўстанова").

З А Ў В А Г І:

[1] У дадзенай табліцы разглядаецца менавіта такая арганізацыйна-прававая форма, як грамадзкае аб'яднаньне грамадзянаў, без уліку асаблівасьцяў стварэньня і рэгістрацыі палітычных партыяў і прафэсійных саюзаў.

[2] Для падачы ў рэгіструючы орган дакумэнтаў для дзяржаўнай рэгістрацыі неабходна ўзгадніць найменьне фонду і ўстановы ў Міністэрстве юстыцыі Рэспублікі Беларусь.

[3] Напрыклад, за парушэньне патрабаваньняў, прадугледжаных часткамі першай-трэцяй п. 4 Дэкрэту Прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь ад 28.11.2003 году № 24 "Пра некаторыя захады па ўдасканаленьні парадку атрыманьня і выкарыстаньня замежнай бязвыплатнай дапамогі".

[4] Калі адказныя асобы грамадзкага аб'яднаньня не забясьпечылі парадак арганізацыі альбо правядзеньня сходаў, мітынгаў, вулічных шэсьцяў, дэманстрацыяў і пікетаваньня, што пацягнула за сабой нанясеньне шкоды ў буйным памеры ці істотнай шкоды правам і законным інтарэсам грамадзянаў, арганізацыяў альбо дзяржаўным ці грамадзкім інтарэсам.

Румынскі дысыдэнт

У турму ён трапіў з-за Дзяржынскага, а ў трэці сэктар - з Уралу

У сакавіцкім нумары "Асамблеі" мы пазнаёмілі нашых чытачоў зь дзейнасьцю ў сталіцы Букавіны Чарнаўцах найстарэйшай грамадзкай арганізацыі краю "Ўкраінскі Народны Дом". Мы працягваем тэму і на гэты раз распавядаем пра румынскіх грамадзкіх актывістаў. Адзін зь іх, Аркадзь Опаец, вызначыўся тым, што зарабіў грошы на грамадзкую дзейнасьць на лесапавале.

Аркадзь Опаец (на здымку) узначальвае абласное таварыства румынскай культуры і адначасова зьяўляецца прэзыдэнтам "Лігі абароны правоў чалавека" ў Чарнавіцкай вобласьці. Яшчэ ў савецкія часы сп. Опаеца выключылі з унівэрсытэту за "антысавецкую дзейнасьць і румынскі нацыяналізм". "Сказаць тады, што ты - румын і хочаш у румынскую школу, не разумееш, чаму яна называецца малдаўскай, спытацца, чаму трэба пісаць кірыліцай, а не лацініцай - гэта называлі румынскім нацыяналізмам", - гаворыць ён. Некалькі разоў Аркадзь Опаец трапляў за краты. Аднойчы, калі працаваў у мастацкім фондзе, арганізаваў продаж бюста Дзяржынскага мясцоваму ўпраўленьню ўнутраных справаў. А пасьля яго абвінавацілі ў тым, што зрабіў гэта за хабар...

А. Опаец распавядае, што атрымаў "правільнае" выхаваньне ў сям'і, якая да раскулачваньня была заможнай, а ягоны дзед нават меў ад імпэратара Аўстра-Вугоршчыны дваранства. У 1941 г. трынаццаць тысяч сем'яў за адну ноч былі высланыя ў Сыбір. Зь сям'і Опаеца на чужыне памерлі 12 чалавек. Яму, яшчэ падлетку, старэйшыя казалі, што "калі сыйдуць расейцы, тады нам вернуць землі і адкрыюць цэрквы". І ўсе мясцовыя жыхары з надзеяй глядзелі на Захад. Глядзяць туды і цяпер.

ГРОШЫ ЗАРАБІЎ НА ЛЕСАПАВАЛЕ

Румынскі грамадзкі дзяяч кажа, што грошы на дзейнасьць сваіх арганізацыяў зарабіў сам... на лесапавале. Да пачатку 90-х гадоў ён працаваў у Расеі, на Ўрале, накапіў грошай і вярнуўся на Бацькаўшчыну. Але ня стаў будаваць сабе дом і нават не купіў машыну. Усе грошы Опаец патраціў на грамадзкую дзейнасьць. Ужо пяць гадоў ён сваімі сродкамі аплачвае арэнду памяшканьня пад офіс і камунальныя паслугі. Але на гэтым не спыняецца - заснаваў свае прэміі (адну зь іх, у памеры 400 даляраў, атрымаў старшыня Саюзу пісьменьнікаў Малдовы), адкрыў тры помнікі нацыянальным героям.

У Букавіне існуе Саюз румынскіх абшчынаў, у які ўваходзяць пяць арганізацыяў. Сваркі паміж яго сябрамі здараюцца нярэдка, але калі справа датычыцца агульнанацыянальных пытаньняў, разыходжаньняў не бывае. Асобна існуюць "Ліга моладзі", Таварыства румынаў-мэдыкаў, таварыства "Галгофа" (яно займаецца праблемамі рэпрэсіяў і дэпартацыяў), дзейнічае Румынскі Народны Дом.

"Мы не дазваляем нас крыўдзіць, а зь іншага боку - праводзім прынцыповую нацыянальную палітыку, - кажа сп. А. Опаец. - Тое, што належыць нам, просім аддаць, тое, што ня наша - на гэта не прэтэндуем. Жывем па прынцыпе ўзаемнай павагі. У нас, на Букавіне, талерантнасьць і павага - гэта гістарычная традыцыя".

МАЛЕНЬКАЕ МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ

Румыны складаюць у Букавіне меншасьць. Паводле словаў сп. Опаеца, іх тут каля 20%, але ў гэтую лічбу ўваходзяць 117 тысяч румынаў і каля 120 тысяч малдаванаў. "Нас падзялілі на румынаў і малдаванаў дзеля таго, каб мы не набралі 20% і не ўпісаліся ў Хартыю рэгіянальных моваў і моваў нацыянальных меншасьцяў, - кажа грамадзкі дзяяч. - Малдаў-

{ ІНФАРМАТАР }

ГРАНТЫ Ў СФЭРЫ ГУМАНІТАРНЫХ НАВУК

Humanities Program in Belarus, Russia and Ukraine
American Council of Learned Societies, 633 Third Avenue, New York, NY 10017-6795, USA

Tel.: 1-212-697-1505, fax: 1-212-949-8058, e-mail inquiries hp@acls.org

Амэрыканская рада навуковых таварыстваў (АРНТ) аб'яўляе конкурс на атрыманьне кароткатэрміновых грантаў у сфэры гуманітарных навук у 2004-2005 навучальным годзе. Рашэньні аб прадастаўленьні грантаў будуць прымацца на падставе ананімнага рэцэнзаваньня ("peer review") пісьмовых заявак незалежнай камісіяй, якая складаецца з аўтарытэтных вучоных зь Беларусі, Расеі, Украіны і заходніх краінаў. Грантамі будуць адзначацца выдатныя навуковыя работы, якія стымулююць працу іншых. Доўгатэрміновая мэта гэтай праграмы - забясьпечваць устойлівае разьвіцьцё навуковай працы ў гуманітарнай сфэры ў Беларусі, Расеі і на Ўкраіне.

Права на ўдзел у конкурсе. Удзельнік конкурсу:

- павінен мець кандыдацкую ступень альбо прадэманстраваць адпаведны прафэсійны досьвед;
- павінен быць грамадзянінам і пастаянна пражываць у Беларусі, Расеі ці на Ўкраіне;
- не абавязкова павінен валодаць ангельскай мовай;
- мусіць выкарыстоўваць сродкі ў межах рэгіёну, не дзеля вандровак ці пражываньня за яго межамі;
- ня мае права на ўдзел, калі раней атрымліваў грант АРНТ.

Права на ўдзел у конкурсе. Дысцыпліны:

Прымальнымі зьяўляюцца ўсе гуманітарныя дысцыпліны і тэмы, такія як гісторыя, літаратура, мовы і мовазнаўства, філязофія, культуралёгія, рэлігіязнаўства, мастацтвазнаўства (выяўленчае і выканаўчае), гендэрныя дасьледаваньні і інш. Праекты па сацыяльных навуках, такіх як паліталёгія, сацыялёгія, эканоміка, міжнародныя адносіны і псыхалёгія, раз-

. . . . . .

скай мовы і нацыянальнасьці "малдаванін" не існуе. Як можна ўкраінца, напрыклад, з Харкаўскай вобласьці, лічыць па нацыянальнасьці харкаўчанінам?"

Сваё таварыства ён называе "маленькім міністэрствам культуры", якое мае 46 філіяў па ўсёй вобласьці, у чатырох раёнах, дзе кампактна жывуць румыны. Толькі ў вёсках яно налічвае каля 8 тысяч сябраў. Таварыства выдае газэту на румынскай мове, ладзіць у год чатыры фэсты нацыянальнай культуры (зь іх два - міжнародныя), мясцовыя фэсты навагодніх абрадаў і звычаяў, веснавое нацыянальнае сьвята.

Што да адукацыі, то яна ў т.зв. "малдаўскіх школах", у якіх навучаецца больш за 20 тыс. дзяцей, вядзецца пераважна на румынскай мове. Праўда, не паўсюль такія школы дазваляюць адкрываць. "У параўнаньні зь іншымі дзяржавамі, калі быць аб'ектыўным, становішча ў нас адносна някепскае. Законы вельмі добрыя і адпавядаюць эўрапейскім стандартам. Іншая справа, як яны выконваюцца", - гаворыць сп. Опаец.

Застаецца адкрытай праблема вышэйшай адукацыі на румынскай мове. Праз таварыства румынскай культуры тысячы маладых людзей былі накіраваныя ў Румынію для атрыманьня сярэдняй і вышэйшай адукацыі, але вярнуліся адтуль толькі адзінкі. Аднойчы на сустрэчы з румынскай дэлегацыяй выступаў начальнік упраўленьня адукацыі і навукі ды паабяцаў садзейнічаць адпраўцы як мага большай колькасьці моладзі на вучобу ў Румынію. Пасьля яго выступіў Аркадзь Опаец і сказаў, што "будзе рабіць усё магчымае, каб у Румынію ехала як мага менш дзяцей, бо ў адваротным выпадку праз дзесяць гадоў тут застануцца адны старыя..."

ГРАМАДЗКАЯ ПРАЦА З ДАПАМОГАЙ... ІНФАРМАТАРАЎ

"З уладамі наладжаныя някепскія адносіны", - кажа сп. Опаец. Паводле яго словаў, улады лічацца з румынскімі арганізацыямі і паважаюць іх, а ў румынскіх вёсках мясцовымі органамі ўлады кіруюць румыны. Праўда, без праблемаў не бывае. Са 110-ці дэпутатаў абласной Рады 9 - румыны, але яны ня могуць дамовіцца, каб стварыць сваю фракцыю. Прычына ў тым, што гэта пераважна чыноўнікі, якія знаходзяцца пад кантролем...

Спадар Опаец, можна сказаць, вымушана стварыў таварыства "Ліга абароны правоў чалавека". Неаднойчы яму як кіраўніку таварыства румынскай культуры даводзілася займацца і абаронай правоў чалавека. Чыноўнікі пачалі казаць, што ён перавышае свае паўнамоцтвы: "У адпаведнасьці са статутам ты павінен танчыць, чытаць вершы, а ня лезьці ў такія справы". Тады ў 2000 г. ён зь сябрамі заснаваў "Лігу".

"Ліга абароны правоў чалавека" ўжывае своеасаблівыя мэтады працы. Напрыклад, яе актывісты часта наведвалі зь лекцыямі па правах чалавека нават аддаленыя хутары і прапаноўвалі мясцовым жыхарам стаць... інфарматарамі. Усе, хто пагадзіўся, атрымалі ад актывістаў "Лігі" кантактныя тэлефоны, уключаючы хатні тэлефон кіраўніка арганізацыі. І пра кожны выпадак парушэньня правоў чалавека прадстаўнікамі ўлады, нават дзесьці на вёсцы, становіцца вядома. Пасьля гэтага праваабаронцы выклікаюць на "шчырую размову" гэтага чыноўніка.

Ядвіга Мацкевіч

Падрыхтавана па матэрыялах місіі Працоўнай групы НДА краінаў СНД па папярэджаньні і ўрэгуляваньні канфліктаў (сьнежань 2003; Ад Беларусі ў склад Місіі ўваходзіў тагачасны старшыня Асамблеі НДА Алесь Бяляцкі). Справаздача пра місію выйшла асобным выданьнем у Менску ў 2004 г. у аналітычнай апрацоўцы паліталяга Андрэя Казакевіча.

глядацца ня будуць, за выключэньнем тых выпадкаў, калі дасьледаваньне заснавана на вывучэньні гісторыі ці культуры.

Права на ўдзел у конкурсе. Тыпы праектаў:

- архіўныя ці палявыя дасьледаваньні з мэтай публікацыі вынікаў у выглядзе кнігі-манаграфіі, збораў крыніцаў або іншай значнай навуковай прадукцыі;
- праца над архіўнымі ці музэйнымі калекцыямі, скіраваная на тое, каб зрабіць іх больш карыснымі для канкрэтных дасьледчых праектаў;
- запрашаюцца калектыўныя праекты (адзін з удзельнікаў падае заяўку ад імя ўсёй групы на ўмовах, згаданых у заяўцы).

Каб атрымаць блянк заяўкі, калі ласка, пішыце на адрас hp@acls.org у любы час да першага верасьня 2004 году. Выкарыстоўвайце ангельскую, беларускую, расейскую ці ўкраінскую мовы. **У вашым звароце, калі ласка, паведамце:** вашыя імя і прозьвішча, назва ўстановы, дзе вы працуеце, краіна і горад, у якім вы жывяце, паштовы адрас для звычайнай пошты і адрас вашай электроннай пошты, год абароны вашай кандыдацкай дысэртацыі, кароткае апісаньне вашага праекту (ня больш за 10-15 словаў).

Калі ласка, паведамце, як вам лепш дасылаць блянк заяўкі - паветранай ці электроннай поштай (файл у фармаце Microsoft Word ці PDF).

Блянк заяўкі будзе дасылацца вам у пачатку верасьня 2004 году. Запоўненая заяўка павінна быць атрымана АРНТ не пазьней за 15 лістапада 2004 году. Дакладныя памеры грантаў будуць залежаць ад наяўнасьці сродкаў, але найбольш верагодны памер грантаў - ад трох да чатырох тысяч даляраў ЗША. Афіцыйныя паведамленьні аб прадастаўленьні ці непрадастаўленьні грантаў будуць дасылацца авіяпоштай у траўні 2005 году.

Па агульную інфармацыю аб праграме, калі ласка, зьвяртайцеся на наш вэб-сайт:

http://www.acls.org/humanities-byruuk.htm

ПАДРЫХТОЎКА ТРЭНЭРАЎ ПА ЭКАНАМІЧНАЙ АСЬВЕЦЕ

Нацыянальная рада па эканамічнай адукацыі (ЗША) плянуе падрыхтаваць 110 трэнэраў па дзьвюх праграмах "Падрыхтоўка трэнэраў", кожная зь якіх складаецца з чатырох сэмінараў у краінах Усходняй Эўропы. Мовы навучаньня - расейская і ангельская. Па заканчэньні праграмы выпускнікі будуць распаўсюджваць атрыманыя эканамічныя веды ў сваіх супольнасьцях пры далейшай падтрымцы з боку Нацыянальнай рады. Для ўдзелу ў праграме запрашаюцца пэдагогі з навучальных установаў і трэнэры зь няўрадавых арганізацыяў. Усе выдаткі, зьвязаныя з удзелам у праграме, кампэнсуюцца арганізатарамі.

Падрабязная інфармацыя - http://www.ncee.net/ei/

СТЫПЭНДЫІ ДЛЯ НАВУЧАНЬНЯ Ў ОКСФАРДЗЕ

Фонд Reuters Foundation абвяшчае конкурс стыпэндыяў, у якім могуць узяць удзел журналісты любой краіны, што пішуць на тэмы аховы навакольнага асяродзьдзя і экалёгіі. Удзельнікі конкурсу (узрост - ад 28 да 45 гадоў) мусяць мець як мінімум пяцігадовы прафэсійны досьвед. Праграма фінансуе пражываньне, праезд, сутачныя. Дэдлайн - 5 ліпеня 2004 году.

Формы заявак апублікаваныя на сайце Reuters Foundation:
http://www.foundation.reuters.com/Fellowships/oxford_applying.asp

Падрабязная інфармацыя пра стыпэндыі апублікаваная на
http://bfsd.server.enovum.com/en/content/view/69/

ПАДТРЫМКА САМАСТОЙНЫХ ДАСЬЛЕДАВАНЬНЯЎ

Акадэмія міжнароднай адукацыі і дасьледаваньняў (ЗША) і культурна-інфармацыйная ўстанова "Міжнародны дыялёг" абвяшчаюць пра пачатак адкрытага конкурсу па праграме Дзяржаўнага дэпартамэнту ЗША "Актуальныя пытаньні сучаснасьці". Правядзеньне самастойнага дасьледаваньня ў галіне гуманітарных і сацыяльна-эканамічных ведаў у вядучых амэрыканскіх дасьледчых цэнтрах, у дзяржаўных і недзяржаўных арганізацыях, на прадпрыемствах, ва ўнівэрсытэтах на працягу чатырох месяцаў.

Да ўдзелу ў конкурсе запрашаюцца грамадзяне Беларусі ва ўзросьце 24-55 гадоў, занятыя ў дзяржаўным/недзяржаўным сэктары і якія валодаюць ангельскай мовай.

Прэзэнтацыі праграмы праводзяцца штотыднёва па чацьвяргах у 18:00 у офісе "Міжнароднага дыялёгу" па адрасе: г. Менск, вул. Сурганава, 28А, офіс 104.

Тэл.: +375 17 285 7172; +375 297 564 698;
E-mail: ci@internationaldialogue.org
Дэдлайн - 15 ліпеня 2004 г.

ПРАВААБАРОНЧЫ СЭМІНАР

Сэмінар "Правы чалавека - твае правы", які будзе праходзіць у Польшчы, разьлічаны на настаўнікаў, псыхолягаў, прадстаўнікоў НДА і асобаў, зацікаўленых у папулярызацыі правоў чалавека.

Тэрмін правядзеньня: 17-18 ліпеня 2004 году.

Аплата за ўдзел у сэмінары - 60 злотых. Запіс і дадатковая інфармацыя:

Aleksandra Gocal (+48) 0602 782 625
Aldona Żejmo (+4822) 754 09 69
e-mail: stop-klatka@free.ngo.pl, dchr@o2.pl

МОЛАДЗЕВЫ КОНКУРС ЭСЭ

ААН абвясьціла конкурс эсэ на тэму "Making the most of my qualities" ("Выкарыстаньне напоўніцу сваіх якасьцяў").

Апошні тэрмін падачы работ: 30 чэрвеня 2004 г. Пераможцы будуць абвешчаныя на сайце Goi Peace Foundation: http://www.goipeace.or.jp

Адрас для адпраўкі работ:

International Essay Contest c/o The Goi Peace Foundation
1-4-5 Hirakawacho, Chiyoda-ku, Tokyo 102-0093 Japan
e-mail: essay@goipeace.or.jp

Спэцыфічнае выданьне

Справочник молодежных и детских инициатив. Б. м., б. г., 44 с. Выданьне Беларускага саюзу моладзевых і дзіцячых грамадзкіх аб'яднаньняў "РАДА".

Ня першы раз трапляе ў рукі кніжка беларускіх грамадзкіх аб'яднаньняў, складальнікі і выдаўцы якой не парупіліся прывесьці яе ў адпаведнасьць з агульнапрынятымі бібліяграфічнымі стандартамі. Калі вы хочаце знайсьці ў даведніку год і месца выданьня, то справа гэтая зусім марная. Відаць, аўтары-складальнікі Віталь Нікановіч і Вольга Сацук вырашылі пакінуць такую вось загадку для будучых бібліёграфаў і дасьледчыкаў гісторыі трэцяга сэктару Беларусі. Мы ўжо не гаворым пра адсутнасьць пазнакі пра наклад брашуркі, што было б зусім ня лішнім. Хаця б таму, што выданьне не падпольнае, а афіцыйнае, ды і ініцыятывы дзейнічаюць пераважна ў навучальных установах. Відаць, там і мусіць распаўсюджвацца брашура, а яшчэ сярод "зацікаўленых арганізацыяў". Затое мы ведаем прозьвішчы аж двух дызайнэраў, якія працавалі над даведнікам...

У прадмове выдаўцы паведамляюць, што гэты даведнік - "першы ў Беларусі досьвед абагульненьня працы дзіцячых і моладзевых ініцыятываў". Праўда, не ўдакладняюць, усе ініцыятывы ахопленыя ім ці некаторыя маглі застацца па-за выданьнем. Асноўнай мэтай даведніка В. Нікановіч і В. Сацук называюць "садзейнічаньне разьвіцьцю партнэрскіх адносінаў у асяродзьдзі грамадзкіх аб'яднаньняў". "РАДА" ўжо чатыры гады рэалізуе праект "Рух у падтрымку дзіцячых і моладзевых ініцыятываў" пры падтрымцы прадстаўніцтва Дзіцячага фонду ААН у Рэспубліцы Беларусь. Нарэшце ўзьнікла патрэба абагульніць назапашаны матэрыял і "ўдаступніць" яго.

Аўтары-складальнікі паспрабавалі падаць як мага больш поўную інфармацыю пра ініцыятывы. У табліцы можна знайсьці зьвесткі пра накірунак і мэту дзейнасьці, колькасьць удзельнікаў (іншы раз нават іх сярэдні ўзрост), кантактную асобу і каардынаты, а таксама пра арганізацыю, пры якой "базуецца" ініцыятыва (паўтара дзясяткі працуюць самастойна). Усе ініцыятывы падзеленыя па вобласьцях, што спрыяе параўнальнаму аналізу актыўнасьці дзяцей і моладзі ў розных рэгіёнах краіны. Найбольш тут вылучаюцца Гарадзеншчына і Магілёўшчына, Меншчына саступае нават Гомельшчыне, а Берасьцейшчына прадстаўлена найменш.

Многія моладзевыя і дзіцячыя ініцыятывы Беларусі займаюцца самакіраваньнем і заяўляюць пра сябе як прыхільнікаў здаровага ладу жыцьця.

Шкада, што аўтары-складальнікі сьвядома ўхіліліся ад хаця б мінімальных камэнтараў (а пра аналітыку няма і гаворкі), бо сабраная ў даведнік інфармацыя гэтага патрабуе. Зьмешчаныя ў "Дадатку" графікі ўсё ж такі застаюцца маўклівымі носьбітамі інфармацыі (у некаторых выпадках - ня вельмі якаснымі). Але, нягледзячы на гэта, яны даюць уяўленьне пра сфэры дзейнасьці ініцыятываў. 30% іх займаецца самакіраваньнем у навучальных установах, 16% - прыхільнікі здаровага ладу жыцьця і культуры, 13% - сацыяльнай работы. Усяго 7% цікавяцца журналістыкай, трохі больш - экалёгіяй.

Камэнтары і тлумачэньні аўтараў-складальнікаў, безумоўна, ажывілі б брашуру, якая цалкам складаецца з табліцаў і графікаў. Напрыклад, цікава было б больш даведацца пра самую масавую (270 сябраў) ініцыятыву - "Скарынічы", якая дзейнічае ў Лапіцкай школе ў Асіповіцкім раёне. Яе ачольвае нехта Сташкевіч С. (імя не падаецца - невядомае?), які ў той жа школе кіруе ініцыятывай "Выспа дзяцінства" (на гэты раз 20 сябраў). Затое кіраўніцу палонкаўскай "Школьнай Рады" (Баранавіцкі раён) Капач аж двойчы назвалі Вольгай...

Прыкра, што даведнік выдадзены па-расейску. Бо якраз сярод дзяцей і моладзі варта было б весьці працу на роднай мове, якая для іх не чужая, якую яны вывучаюць, а некаторыя са зьмешчаных у даведніку ініцыятываў - і актыўна прапагандуюць у грамадзтве. Даведнік - выданьне спэцыфічнае, ім могуць карыстацца досыць доўгі час, пакуль ня зьявіцца новае, больш дасканалае. Спадзяемся, што новы даведнік дзіцячых і моладзевых ініцыятываў якраз і выправіць усе выяўленыя хібы. А тое, што ён зьявіцца, сумневу няма. І аўтары абяцаюць яго пэрыядычна перавыдаваць, і ініцыятывы сваёй актыўнасьцю будуць гэтую працу актуалізаваць.

Сямён Асаевіч

Шаноўныя чытачы!

Праз памылку друкарні
старонка №2 - няправільная!

Глядзіце дакладны варыянт
на зваротным баку гэтай укладкі.

KAMUNIKAT.org